Дзяржаўная ўстанова культуры
"Сетка публічных бібліятэк Мсціслаўскага раёна"

# Каляндар
## знамянальных і памятных дат на 2026 год

*Мсціслаўскі раён*



Мсціслаў, 2025

Каляндар знамянальных і памятных дат па Мсціслаўскаму раёну на 2026 год / Мсціслаўская цэнтральная бібліятэка[складальнікС. В. Хмуровіч ; адказны за выпуск Н. В. Сідарэнкава]. — Мсціслаў : Мсціслаўская цэнтральная бібліятэка, 2025.

«Краязнаўчы каляндар» – бібліяграфічнае выданне, якое дапаможа чытачам лепш пазнаць свой край, а бібліятэкарам – прапагандаваць краязнаўчую літаратуру.

Уключаныя ў каляндар знамянальныя і памятныя даты адлюстроўваюць важныя падзеі гісторыі, грамадскага, гаспадарчага і культурнага жыцця нашага раёна, дзейнасць выдатных людзей, звязаных з нашым краем.

Да кожнай даты даецца кароткая даведка, указваецца літаратура. У якой часам сустракаюцца і ілюстрацыі.

Матэрыялы каляндара можна выкарыстоўваць пры рэкамендацыі літаратуры чытачам, арганізацыі выстаў літаратуры, для падрыхтоўкі гутарак, аглядаў літаратуры, тэматычных вечароў, папаўнення краязнаўчых картатэк.

Дзяржаўная ўстанова культуры “Сетка публічных бібліятэк Мсціслаўскага раёна”, 2025

## Знакамітыя падзеі арганізацый

**70 год вытворчаму участку г. Мсціслаўля ААА “Булачна-кандытарская кампанія “Дамачай”**

**25 год ДУА “Мсціслаўскаму раённаму цэнтру карэкцыёна-развіваючаму навучэнню і рэабілітацыі” (01.01.2026)**

**45год ДУА “Дзіцячы сад № 1” (30.10.2026)**

**35 лет ААТ “Сцяг працы” (21.11.2026)**

**60 год ДУ “МДБК” (ноябрь 2026)**

**50 год ДУА “Дзіцячы сад № 3” (05.12.2026)**

**65год ААТ “ПМК-94 “Вадбуд” (19.06.2026)**

## Знакамітыя людзі

З нагоды юбілеяў знакамітых людзей Мсціслаўшчыны раім аформіць бібліятэчныя выставы, тэматычныя паліцы: “Мой край, мае землякі”, “Шчодрая на таленты зямля”, “Працай не хваляцца, а ганарацца”, “Нашы землякі – наша гордасть”, “Кожны край мае тых, хто яго прадстаўляе” і інш.

Падрыхтаваць мерапрыемствы, гадзіны знаёмстваў, краязнаўчыя гадзіны, урокі пазнавання, урокі бацькаўшчыны, краязнаўчыя вандроўкі на тэмы: “Імя ў гісторыі”, “На таленты багатая зямля”, “Знаёмцеся – наш зямляк”, “ Гонар і слава майго краю”, “Жыццё – працоўны подзвіг”, “Яны абаранялі Радзіму”, “З роднаю зямлей свой лес звязалі”, “Зямля іх наша ўзгадавала”, “Ветэраны жывуць побач” і інш.

## Студзень

### 95 год з дня нараджэння Беларускага этнографа, кандыдата гістарычных навук, Гуркова Уладзіміра Сяргеевіча

Нарадзіўся 2 студзеня 1931 г. у вёсцы Шыркі Мсціслаўскага раёна. Беларускі этнограф, кандыдат гістарычных навук (1975).

Скончыў Мсціслаўскае педвучылішча, спецшколу Міністэрства дзяржаўнай бяспекі ў Свярдлоўску і Мінскі педінстытут (1958). З 1952 г. працаваў у органах дзяржаўнай бяспекі, 1960 г. – сакратар абкама прафсаюза

работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых установаў, з 1964 г. – у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (з 1976 г. – старшы навуковы супрацоўнік). У 1976 г. пачаў ствараць Беларускі музей народнай архітэктуры і быту. Гэта музей пад адкрытым небам каля Пцічы (12 км ад Мінска). Група пад кіраўніцтвам У.С. Гуркова праводзіла вялікую даследчую работу. Асноўныя даследаванні ў галіне матэрыяльнай культуры – пасяленні, жыллё, пчалярства. Аўтар манаграфій "Сучасная беларуская вёска" (1975) і "Занятак спрадвеку высакародны" (1987 г., з С. Цярохіным пра пчалярства), кніга "Борніцтва на Беларусі" (1980 г., з С. Цярохіным), раздзелаў "Пасяленні", "Тыпы забудоў", "Гаспадарчыя пабудовы", "Сучаснае сялянскае жыллё", "Змены жыллёвага фонду гарадоў БССР" у калектыўных манаграфіях "Беларускае народнае жыллё" (1973) і "Этнічныя працэсы і лад жыцця" (1980).

**Літаратура:**


Гуркоў Уладзімір Сяргеевіч// Дзеячы выяўленчага мастацтва Магілёўшчыны : Біябібліяграфичны паказальник : складальник Цыбуліва Н.М.—Магілёў, 1993.—С. 18.

Гуркоў Уладзімір Сяргеевіч: Знакамітыя людзі// Памяць : Мсціслаўскі раён : Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Минск, 1999.— С. 525 — 526.

Юрчанка, Г. Даследчык матэрыяльнай культуры/ Г. Юрчанка// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1978.—7 кастрычніка. — № 121. — С. 4.


**95 год з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай Працы, Пісклячэнкі Соф'і Яфімаўны**



Нарадзілася 10.01.1931 г. у вёскі Лядзешня Клімавіцкага раёна. Член КПСС з 1964 г. Скончыла БСГА ў 1956 г. З 1958 г. галоўны аграном, з 1974 г. старшыня калгаса "1 Мая" Мсціслаўскага раёна, з 1979 г. намеснік галоўнага дзяржаўнага інспектара па закупках і якасці сельска–гаспадарчай прадукцыі ў Магілёўскай вобласці.Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1971 г. за поспехі ў развіцці сельска-гаспадарчай вытворчасці і выкананні плана продажу дзяржаве прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1975–1980 гг.

**Літаратура:**


Пісклячэнка Соф'я Яўхімаўна // Беларуская ССР: Кароткая энцыклапедыя.—1981.—Т. 5.—С. 486.

Пісклячэнка Соф’я Яўхімаўна: Героі Сацыялістычнай Працы// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакуменетальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 499.

Анюкоў, М. Землякі слухаюць дзелегата/ М. Анюкоў // Магілёўскаяпраўда.—1969.—17 снежня.

Анюкоў, М. Такая ў нас традыцыя / М. Анюкоў // Магілёўская праўда.—1976.—13 студзеня.

Анюкоў, М. Чалавек справы/ М. Анюкоў // Магілёўскаяпраўда.—1969.—18 лістапада.

Карпенка, М. За вокнамі яблыневы сад/ М. Карпенка // Магілёўскаяпраўда.—1971.—1мая.

Ніканюк, П. Дэлегат з’езда:нарыс/ П. Ніканюк // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1971.—20 лютага.

Приходько, П. Зёрна, налитые солнцем/ П. Приходько // Дела их золотом горят.—Мінск,1976.—С. 322 — 327.

Приходько, П. Зёрна, налитые солнцем/ П. Приходько // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1975.—30 снежня; ЛІМ.—1975.—19 снежня.—С. 13.

**80 год з дня нараджэння вучонага ў галіне інфарматыкі, кандыдата тэхнічных навук, дацэнта, члена-карэспандэнта Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі, Залатарэвіч (Ільянкова ) Людмілы Андрэеўны**



Нарадзілася 16 студзеня 1946 г. у в. Малая Рубанаўка Мсціслаўскага раёна ў сям’і калгаснікаў. Вучоны ў галіне інфарматыкі, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт, член – карэспандэнт Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі. У 1950 г. бацькі пераехалі на пастаяннае месца жыхарства ў в. Шамава Мсціслаўскага раёна. Тут вучылася ў сярэдняй школе, затым у Мсціславе. У 1963 г. скончыла 11 класаў 1-ай сярэдняй школы. У 1968 г. скончыла Мінскі радыётэхнічны інстытут па спецыяльнасці “Электронныя вылічальныя машыны”. Пасля заканчэння інстытута працавала ў Мінску інжынерам на заводзе ЭВМ імя Арджанікідзе. З 1971г. працавала ў вылічальным цэнтры Беларускага дзяржаўнага ўніверсытэта навуковым супрацоўнікам, намеснікам дырэктара па вылічальнай тэхніцы, па навуковай рабоце, а з 1988 г. – загадчыкам навукова-даследчай лабараторыі матэматычнага мадэліравання ў электроніцы на факультэце прыкладной матэматыкі. У 1984 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю. З 1988 г. – старшы навуковы супрацоўнік, з 1993 г. – дацэнт. Адначасова займаецца выкладчыцкай працай, чытае два спецкурсы “Матэматычныя асновы лагічнага праектавання” і “Тэарэтычныя аспекты тэхнічнай дыягностыкі” мае 70 апублікаваных прац.

**Літаратура:**

Залатарэвіч (Ільянкова) Людміла Андрэеўна: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 529.

## 90 год з дня нараджэння Беларускага гісторыка, кандыдата гістарычных навук, старшага навуковага супрацоўніка, Лебедзева Анатоля Дзям'янавіча



Нарадзіўся 26 студзеня 1936 г. у в. Гімбатаўка Мсціслаўскага раёна. Беларускі гісторык, кандыдат гістарычных навук (1976), старшы навуковы супрацоўнік (1984).Скончыў Пустынскую сярэднюю школу (1954), Магілёўскі педагагічны інстытут (1961), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1969). Працаваў у калгасе імя Калініна намеснікам брыгадзіра, служыў на Балтыйскім флоце. З мая 1961 па 1964 г. працаваў інструктарам,кіраўніком лектарскай групы,намеснікам загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі Магілёўскага абкама камсамола, а з 1964 па 1967 г. інструктарам, намеснікам загадчыка аддзела камсамольскіх арганізацый ЦК камсамола Беларусі. З 1969 па 1976 г. – інструктар, загадчык сектара інфармацыі і замежных сувязей, аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ. У 1976–1980 гг. старшы выкладчык, дацэнт Мінскага радыётэхнічнага інстытута, у 1980–1990 гг. – старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, у 1990–1992 гг. – намеснік кіраўніка факультэта перападрыхтоўкі кадраў Мінскай ВПШ і Інстытута паліталогіі і сацыяльнага кіравання ЦК КПБ. З 1991 па 1998 г. – старшы навуковы супрацоўнік Беларускага навукова–даследчага цэнтра (з 1996 г. інстытута) дакументазнаўства і архіўнай справы. З 1998 г. – дацэнт кафедры дзяржаўна–прававых дысцыплін Інстытута кіравання. Даследуе праблемы дзяржаўна–прававога будаўніцтва інфармацыйных тэхналогій. Адзін са складальнікаў зборнікаў "Выбраныя прамовы і артыкулы П. М. Машерова" (1982), "Выбраныя артыкулы і выступленні Ц. Я. Кісялёва" (1984), "Выбраныя творы А. Ф. Мяснікова" (1985), "Архіўная справа на Беларусі ў дакументах і матэрыялах" (1921–1995), (1996) і шэраг іншых кніг.

**Літаратура:**

Лемяшонак, У.І. Лебедзеў Анатоль Дзям'янавіч: Знакамітыя людзі/ У.І. Лемяшонак// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.— С. 533 — 534

## Люты

### 130 год з дня нараджэння вучонага, члена–карэспандэнта АН УССР, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара Рэмеза Яўгена Якаўлевіча



Нарадзіўся 17 лютага 1896 г. у Мсціславе. Вучоны. Член–карэспандэнт АН УССР, доктар фізіка–матэматычных навук, прафесар.

Скончыў Мсціслаўскую гімназію з залатым медалём (1916). У Кіеве паступіў у Інстытут народнай адукацыі (ператвораны ва ўніверсітэт), які з перарывам вучобы закончыў у 1924 г. Працаваў выкладчыкам у розных вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Кіева. У 1926–1929 гг. – аспірант Інстытута народнай адукацыі, у 1930 г. абараніў дысертацыю на ступень навуковага супрацоўніка. З 1934 г. Я.Я. Рэмез старшы навуковы супрацоўнік Інстытута матэматыкі АН УССР, затым загадчык кафедры Кіеўскага педагагічнага інстытута. У 1936 г. абараніў доктарскую дысертацыю. У 1938 г. яму прысвоена званне прафесара. У 1939 г. абраны членам–карэспандэнтам Акадэміі навку УССР. На той час на рахунку яго значылася больш 90 фундаментальных работ, якія знайшлі прымяненне ў народнай гаспадарцы. Усяго яму належыць 120 навуковых прац, уключаючы 5 буйных навуковых манаграфій. Большасць з іх адносіцца да тэорыі функцый і лічбавага аналізу. Некаторыя вынікі па эфектыўных метадах канстрактуктыўнай тэорыі функцыі пастаянна цытуюцца ў навуковай літаратуры многіх краін свету і ім прысвоена імя Рэмеза.

Узнагароджаны медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчынай вайне”, значком “Выдатнік народнай асветы УССР”, медалём Леанарда Эйлера.

### Літаратура:

Рэмез Яўген Якаўлевіч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 538 — 539.

**105 год з дня нараджэння Беларускага гісторыка, журналіста, Доктара гістарычных навук, прафесара, Заслужанага дзеяча культуры БССР, Пыжкова Васіля Андрэевіча**



Нарадзіўся 18 лютага 1921 г. у в. Валымер Мсціслаўскага павета. Беларускі гісторык, журналіст. Доктар гістарычных навук, прафесар. Заслужаны дзеяч культуры БССР. Скончыў БДУ (1958). З 1938 г. на журналісцкай рабоце, у 1943–1951 гг. загадчык аддзела, намеснік рэдактара газеты "Советская Белоруссия". У 1951–1954 гг. – намеснік, у 1954–1969 гг. – рэдактар газеты "Звязда". З 1969 г. у БДУ. Асноўныя працы па тэорыі і практыцы друку. Дэпутат Вярэхоўнага Савета БССР у 1955–1959 гг., 1959–1963 гг., 1963–1967 гг. Двойчы (1959, 1963) быў членам Урада БССР на сэсіях ААН у Нью-Йорку. Па журналісцкіх заданнях ездзіў у Францыю, Германію, Польшу, Чэхаславакію і інш. Узнагароджаны ордэнам Леніна, "Знак Пашаны", медалямі.

**Літаратура:**

Пыжкоў Васіль Андрэевіч: Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 510.

## Сакавік

**110 год з дня нараджэння кандыдата медыцынскіх навук, дацэнта, Кіндурыс Юліі Казіміраўны**



Нарадзілася 6 сакавіка 1916 г. у в. Малькаўка Мсціслаўскага павета. Кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт.

Пасля сканчэння Раснянскай сямігадовай школы працавала ў друкарні ў Мінску вучаніцай, наборшчыцай, адначасова вучылася на вячэрнім рабфаку пры Мінскім медыцынскім інстытуце (1931–1934). Скончыла лячэбны факультэт Мінскага медыцынскага інстытута з адзнакай (1939).

У 1939–1941 гг. працавала ўчастковым урачом у Чэрвенскім раёне Мінскай вобласці. З жніўня 1941 па сакавік 1945 г. – у дзеючай арміі на Ленінградскім, Волхаўскім і 2-ім Беларускім франтах, камандзір узвода 313-га асобнага медыка-санітарнага батальёна, начальнік аддзялення эвакуацыйнага шпіталя. Была цяжка паранена.

З 1945 г. у Мінску працавала галоўным ўрачом хуткай дапамогі, загадчыкам раённага аддзела аховы здароўя. З 1950 па 1959 г. – клінічны

ардынатар, асістэнт кафедры прапедэўтыкі ўнутраных хвароб Мінскага медыцынскага інстытута, з 1961 г. – дацэнт гэтай кафедры. Займалася навукай, апублікавала 25 прац,працавала над доктарскай дысертацыяй на тэму: “Патогенез, клиника и лечение инфекционного неспецифического полиартрита”, якая з-за хваробы не была скончана. Узнагароджана медалём “За доблесную працу”.

Памёрла 10 жніўня 1982 г.

**Літаратура:**

Кіндурыс Юлія Казіміраўна: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 531 — 532.

## 130 год з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза, Паўловіча Івана Міхайлавіча



Нарадзіўся 7.03.1896 г. у вёскі Старое Сяло Мсціслаўскага раёна. Член КПСС з 1919 г. У арміі з 1915 г., у Чырвонай Арміі з 1919 г. Удзельнік Грамадзянскай вайны, потым у пагранічных войсках на Далёкім Усходзе. Скончыў Вышэйшую пагранiшколу НКУС у 1928 г., школу ўдасканалення камсаставу НКУС у 1938 г. З 1943 г. на Цэнтральным, Беларускім і 1-м Беларускім франтах. Удзельнік Курскай бітвы. Намеснік камандзіра стралковай дывізіі палкоўнік Паўловіч Іван Міхайлавіч вызначыўся пры вызваленні Беларусі. 24.06.1944 г. падняў батальён на прарыў варожай абароны на р. Друць каля  г. Рагачова і захапіў траншэі праціўніка, 29.06.1944 г. арганізаваў фарсіраванне р. Берэзіна, у ліку першых уварваўся ў Бабруйск; 19.07.1944 г. на паўднёвазаходнім напрамку ад Брэста ўзначаліў полк, які адбіў атаку 60 варожых танкаў. Загінуў у гэтым баі. Яго імем названы вуліцы ў г. Мсціслаўлі і г. Хабараўску.

Загінуў 19.07.1944 г.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Саюза ССР Указам ад 6 красавіка 1945 г. пасмяротна прысвоіў Павловічу Івану Міхайлавічу званне Героя Савецкага Саюза.

**Літаратура:**

Паўловіч Іван Міхайлавіч //Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941 – 1945 : энцыклапедыя/ Беларуская Савецкаяэнцыклапедыя.—Мінск, 1990.—С. 490.

Павлович И. М. // Герои Советского Союза: краткий биографический словарь в 2-х т. Т. 1.—Москва, 1987.—С. 223.

Павлович Иван Михайлович // Навечно в сердце народном: справочник.—3-е изд.—Минск,1984.—С. 397 — 398.

Павлович Иван Михайлович // Герои Советского Союза могилевчане.—Минск, 1965.—С. 108 — 110.

Паўловіч Іван Міхайлавіч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакумнтальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 252.

Героі – нашы землякі // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1975.—9 мая.

Іваноў, П. Яркае жыццё/ П. Іваноў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1980.—12 студзеня.

Не лічачы ворагаў // Магілёўскаяпраўда.—1970.—11 ліпеня.

Павлович Иван Михайлович // Нёман.—1967.— № 10.—С. 75.

Партыяй выхаваны // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1972.—25 лістапада.

Праслаўлены камандзір // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1970.—21 лютага.

Салаўёў, М. Аднапалчане – героі/ М. Салаўёў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі.—1976.— № 3.—С. 44 — 46.

Салаўёў, М. Баявы шлях камандзіра/ М. Салаўёў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1978.—16 лютага.

Стаяў насмерць // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1979.—3 ліпеня.

Уатаку вёў Паўловіч // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1970.—18 ліпеня.

## 130 год з дня нараджэння прафесара, Германовіча Аляксандра Іларыёнавіча



Нарадзіўся 8 сакавіка 1896 г. у вёскі Радзівонаўка Мсціслаўскага раёна ў сям'і селяніна-арэндатара. Вучыўся у Мсціславе, у Магілёве. Атрымаўшы сярэднюю адукацыю, у 1916 г. паступае ў Нежынскі гісторыка-філалагічны інстытут. Праз год вучобу давялося перапыніць і вярнуцца на радзіму, дзе працуе настаўнікам. Потым вяртаецца ў Нежын і ў 1922 г. заканчвае інстытут. І зноў настаўнічае ў Беларусі, на Смаленшчыне, у Маскоўскай вобласці. На пачатку 30-х гадоў вучыцца ў аспірантуры. Затым выкладае расійскую мову ў Наўгародскім настаўніцкім інстытуце, у Казахстанскім і Дагестанскім педінстытутах, у Сімферопальскім універсітэце. У 1938 г. абараніў кандыдатскую дысертацыю, у 1962 – доктарскую. Яму дадзена вучонае званне прафесара. Большую частку сваіх навуковых даследванняў А.І. Германовіч прысвяціў выклічнік. Яго працы атрымалі высокуюацэнку

навуковай грамадскасці. Ён паказаў, што выклічнікі – гэта словы-сігналы. Цікава падмечана іх шматзначнасць. Вучоны прапанаваў класіфікацыю выклічнікаў: эмацыянальныя, якія выражаюць пачуцці і імператыўныя, што выражаюць волю, загад, а таксама вызначыў іх істотныя прыкметы – высокую эмацыянальнасць, адсутнасць лексічнага значэння, своеасаблівасць інтанацыйнага афармлення, сувязь з мімікай і жэстамі. У яго працах паказана разнастайнасць структуры выклічнікаў і іх утварэння. Значная іх колькасць утворана шляхам пераходу з іншых часцін мовы – назоўнікаў, дзеясловаў, прыслоўяў.

Цікавыя назіранні А.Германовіча над месцам выклічнікаў у сістэме сінтаксісу. Адны з іх сувязь з іншымі словамі не ўступаюць, другія ўключаюцца ў сказ, выступаюць у ролі яго членаў. Вучоны прыводзіць прыклады з запісаў беларускага фальклору, асобныя ўзоры выклічнікаў з гаворкі Мсціслаўшчыны. У 1966 г. выйшла з друку яго капітальнае даследванне “Выклічнікі ў рускай мове”. Аутар абагульніў багаты і разнастайны матэрыял, прасачыў развіццё гэтай часціны мовы ад старажытнасці да нашых дзён, паказаў яе словаутваральнасць, сінтаксічныя, фармальна-інтанацыйныя магчымасці.

А.Германовіч праявіў сябе ўмелым педагогам, метадыстам, выхавацелем. Ён часта выступаў з дакладамі, дзяліўся вопытам, даваў каштоўныя парады па методыцы выкладання, пісаў метадычныя рапрацоўкі.

Памёр А.І.Германовіч у 1973 годзе.

**Літаратура:**

**Асноўныя навуковыя працы:**

Звуковые жесты// Вопросы теории и языка: сборник статей, посвящённых памяти Б.А. Ларина.—Ленинград,1969.—С. 291 — 297.

Интеръективация фразеологизмов// Учёные записки МОПИ. Выпуск 160: Русский язык. Выпуск 11.—1966.—С. 307 — 320.

Интонация и вопросы изменения значений слова и его грамматической формы// Итоговая научная конференция профессорско-преподавательского состава Крымского педагогического института: тезизы доклада.—Симферополь, 1964.

К вопросу об интонации звукоподражательных слов// Учёные записки МГПИ.—1969.—№ 341.—С. 69 — 76.

К вопросу об этимологии фразеологизмов// Проблема фразеологии и задачи её изучения в высшей и средней школе: тезисы докладамежвузовской конференции (Череповец, 30 мая-2 июня 1965 г.).—Вологда, 1965.—С. 46 — 47.

Междометия русского языка: пособие для учителя.—Киев, 1966.—172 с.

Междометия и звукоподражательные слова в стиле М.Горького// Словоупотребление и стиль М.Горького.—Ленинград, 1962.—С. 104 — 119.

Опыт анализа языка, стиля и поэтики стихотворения А.С. Пушкина «Зимняя дорога»// Русский язык в школе.—1970.—№ 3.—С. 10 — 15.

Синтаксические свойства междометий// Русский язык в школе.—1957.—№ 6.—С. 29 — 33.

**Аб жыцці і навуковай дзейнасці:**

Германович А.И.,Булахов М.Г. Восточнославянские языковеды: библиографическийсловарь. Т.2/ М.Г. Булахов.—Минск, 1977.—С. 154 — 155.

Германовіч А.І. Мовазнаўцы Магілёўшчыны: бібліяграфічны паказальнік.—Магілёў, 1998.—С. 31 — 32.

Германовіч Аляксандр Іларыёнавіч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 524.

Войценкаў, М. Доктар навук з Радыёнаўкі/ М. Войценкаў// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1970.—29 студзеня.

ИжакевичГ.П. Научная разработка вопросов российского языкознания на Украине/ Г.П. Ижакевич// Языкознание на Украине за пятьдесят лет.—Киев, 1967.—С. 252.

Мигирин, В.Н., Германович А.И., МигиринВ.Н., ПоповР.Н. // Рус. яз. в шк.—№ 3.—С. 128.

Над чем работают русисты страны// Русский язык в школе.—1968.—№ 2.—С. 92 — 96.

Юрчанка, Г. Адданасць адной тэме/ Г. Юрчанка//Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1990.—1 мая.

Юрчанка, Г. Аляксандр Іларыёнавіч Германовіч/ Г. Юрчанка// Наша слова.—1996.— 20 сакавіка. —С.4.

Юрчанка, Г. Вучоны-мовазнаўца/ Г. Юрчанка// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1996.—2 сакавіка.

Юрченко, Г. Он знал о междометиях всё/ Г. Юрченко// Белорусская нива.—1996.—7 марта.—С. 6.

## 140 год з дня нараджэння ўдзельніка Кастрычніцкай рэвалюцыі, Юрчанка Кандрата Антонавіча



Нарадзіўся 15 сакавіка 1886 г. у в. Баравец Мсціслаўскага павета ў сям'і патомных земляробаў. У 1914 г. быў прызваны ў царскую армію. Удзельнік першай сусветнай вайны. У лістападзе 1917 г. стаў бальшавіком. У сакавіку 1918 г. Усесаюзнае бюро ваенных камісараў накіравала К. Юрчанку ў распараджэнне Мсціслаўскага павятовага выканкама. На 5

павятовым з’ездзе Саветаў , які праходзіў у чэрвені 1918 г., быў выбраны дэлегатам на 5 Усерасійскі з’езд Саветаў. З красавіка 1919 г. былы унтэр-афіцэр – на Заходнім фронце ў радах 1-ай літоўскай стралковай дывізіі. Чырвонай Арміі патрабаваліся вопытныя камандзіры, і К. Юрчанку накіравалі на вучобу ў Вышэйшую маскоўскую стралковую школу, а пасля – выкладчыкам ваенных курсаў у Смаленск.

У 1922 г. быў выбраны старшынёй Манастыршчанскага валаснога выканкама. У 1925 г. скончыў юрыдычныя курсы ў Смаленску і працаваў пракурорам у г. Белый Смаленскай вобласці, з 1932 г. – дырэктарам Сафонаўскай МТС у той жа вобласці. З 1938 г. – у абласным зямельным аддзеле.

**Літаратура:**

Юрчанка Кандрат Антонавіч: удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў беларусі.—Мінск, 1999.—С. 118 — 119.

## 125 год з дня нараджэння фізіёлага, неўролага, члена-карэспандэнта Акадэміі навук СССР, доктара медыцынскіх навук, прафесара Грашчанкова Міхаіла Іванавіча

Нарадзіўся 26 сакавіка 1901 г. у в. Забор’е Мсціслаўскага павета. Фізіёлаг і неўролаг, член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР (1939), правадзейны член Акадэміі медыцынскіх навук СССР (1944 ), правадзейны член АН БССР (1947), доктар медыцынскіх навук (1935), прафесар, удзельнік Першай сусветнай вайны і ўстанаўлення Савецкай улады на Беларусі.

Скончыў медыцынскі факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. З 1926 па 1929 г.- ардынатар, асістэнт нервовай клінікі медыцынскага факультэта 1-га Маскоўскага медыцынскага інстытута, а з 1931 г. – дырэктар Інстытута вышэйшай нервовай дзейнасці, з 1933 г. – загадчык аддзела фізіялогіі органаў пачуццяў Усесаюзнага інстытута эксперыментальнай медыцыны ў Маскве (УІЭМ). У 1935–1937 гг. працаваў у лабараторыях Англіі і ЗША па даследванні органаў пачуццяў і фізіялогіі нервовай сістэмы. З 1937 г.зноў загадчык аддзела фізіялогіі органаў пачуццяў, з 1944 г. – дырэктар Інстытута неўралогіі АН СССР, з 1947 г. прэзідэнт Акадэміі навук БССР, з 1951 г. - у Маскве: загадчык кафедры нервовых захворванняў, з 1958 г. – дырэктар клінікі нервовых захворванняў і мединстытута імя І. М. Сечанава. Адначасова з 1954 г. працаваў у лабараторыі па вывучэнні нервовых і гумаральных рэгуляцый, з 1959 г. – намеснік Генеральнага дырэктара Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Навукова–даследчая дзейнасць прафесара Грашчанкава ахоплівае розныя галіны эксперыментальнай фізіялогіі,

нейрафізіялогіі, нейрапаталогіі, а ў перыяд Айчынай вайны нейрахіругіі. Апублікаваў больш 300 навуковых прац і пяць манаграфій. У радзе прац ім асветлены праблемы, звязаныя з захворваннем камарыным і кляшчовым энцэфалітам.

З 1937 па 1939 г. – першы намеснік Народнага камісара аховы здароўя СССР, быў старшынёй Вучонага Медыцынскага Савета Міністэрства аховы здароўя СССР, членам ВАК, адказным рэдактарам і намеснікам галоўнага рэдактара Вялікай медыцынскай энцыклапедыі, з’яўляецца членам Уругвайскага навуковага таварыства імя прафесара Фултана.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, двума Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Памёр 8 кастрычніка 1965 г.

**Літаратура:**

Грашчанкаў Міхаіл Іванавіч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.— С. 525.

## Красавік

### 90 год з дня нараджэння настаўніка пачатковых класаў Валяковай Марыі Трафімаўны

Нарадзілась 11. 4. 1936 г. Узнагароджана нагрудным знакам “Выдатнік адукацыі”.

### 120 год з дня нараджэння літаратуразнаўца і фальклрыста, члена-карэнспандэнта АН БССР, доктара філалагічных навук, прафесара, Гутарава Івана Васільевіча



Нарадзіўся 15.4.1906 г. у в. Воўкаўка Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям’і. Літаратуразнавец і фальклрыст. Член-карэнспандэнт АН БССР (1953), доктар філалагічных навук, прафесар (1949).

Бацькі Івана Гутарава памёрлі да рэвалюцыі. Выхоўваўся ў дзіцячых дамах. З 1920 па 1924 г. – у Леменской вопытна-паказальнай школе-камуне, створанай П. Лепяшынскім. Тут атрымаў сярэднюю адукацыю. Скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ (1928). Выкладваў рускую літаратуру ў Магілёўскім палітасветным і педагагічным інстытутах, загадваў кафедрай, быў дэканам філалагічнага факультэта (1928–1938). У 1932–1938 гг. выбіраўся адказным сакратаром СП Магілёўшчыны і рэдактарам літаратурнай старонкі ў газеце “Камунар Магілёўшчыны”. У 1939г.

датэрмінова скончыў аспірантуру і абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Паэтычнае майстэрства Маякоўскага". З 1939 па 1941 г. – дацэнт, загадчык кафедры БДУ і вучоны сакратар Аддзялення грамадскіх навук АН БССР. У 1941 г. добраахвотна ўступіў у дзеючую Чырвоную Армію – быў старшым інструктарам палітаддзела.

Ваяваў у тыле ворага. З'яўляўся арганізатарам, камісарам партызанскіх атрадаў, узначальваў многія баявыя аперацыя. Быў прызначаны начальнікам агітацыі і прапаганды партызанскага краю Бранскіх лясоў. У 1943 г. адазваны ў Маскву для выканання спецдаручэнняў.

У 1947 г. скончыў дактарантуру пры інстытуце сусветнай літаратуры імя М. Горкага. Працаваў у ЦК КП Беларусі загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі. З 1951 г. – загадчык кафедры рускай літаратуры БДУ. З 1957 г. – загадчык сектара фальклору інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.

Аўтар даследванняў, прысвечаных пытанням фальклору, эстэтыкі, філасофіі.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага сцяга, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

Памёр 08.02.1967 г.

**Літаратура:**

**Аб жыцці і творчасці:**


Гутараў Іван Васільевіч// Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т.— Мінск, 1985.—Т. 2.—С. 241.

Гутараў Іван // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : 6 т. Т. 2. — Мінск, 1993. — С. 301 — 303.

Гутараў Іван Васільевіч: знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 526 — 527.

Гутараў Іван Васільевіч// Пісьменнікі Магілёўшчыны: бібліяграфічны паказальнік: складальнікі: Новікава Н.А., Катлёнак А.А.—Магілёў, 1993.—С. 67 — 68.

Іван Гутараў// Пісьменнікі Савецкай Беларусі: кароткі даведнік.—Мінск, 1981.—С. 111.

Іван Гутараў// Ішла вайна народная...: Беларускія пісьменнікі ў Вялікай Айчыннай.—Мінск, 1991.—С. 202.

Курбека, І. 80 гадоў з дня нараджэння І.В. Гутарава, беларускага савецкага крытыка і фалькл方рыста/ І. Курбека// Полымя.—1986.—№4.— С. 222 — 223.

Малочка, М. Выхаванец школы – камуны/ М. Малочка// Настаўніцкая газета.—1966.—2 красавіка.

Фядосік, А. З сыноўняй адданнасцю Радзіме: І. Гутараву–70/ А. Фядосік// Беларусь.—1976.—№4.— С. 27.

**Творы і рэцэнзіі на іх:**

Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць.—Мінск, 1967.—С. 6 — 46; 310 — 324 — 357.

Васілёнак, С.І. Вусна–паэтычная творчасць беларускага народа: Хрэстаматыя для вышэйшых навучальных устаноў/ С.І. Васілёнак, І.В. Гутараў.—Мінск: Выдавецтва АН БССР, 1957.—143 с.

Основы советского литературоведения.—3 изд.—Мінск: Вышэйшая школа, 1967.—352 с.

Поэтическое мастерство В.В. Маяковского.—Москва: Учпедгиз, 1950.—160 с.

Советский патриотизм – великая животворная сила.—Минск: Издательство АН БССР, 1949.—26 с.

Сучасны беларускі фальклор: склаў І.В. Гутараў.—Мінск: Выдавецтва АН БССР, 1963.—143 с.

## 120 год з дня нараджэння члена літаратурнага аб’яднання “Маладняк”, Фаміна Сяргея Уладзіміравіча



Нарадзіўся 29 красавіка 1906 г. у в. Пепелеўка Манастыршчаскага раёна Смаленскай вобласці ў сям’і настаўніка. Скончыў Магілёўскі педтэхнікум (1925). Два гады працаваў настаўнікам на Барысаўшчыне. Скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факльтэта БДУ (1930). Выкладаў беларускую і рускую літаратуру ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. Член літаратурнага аб’яднання “Маладняк”, БелАПП і інш. 04.01.1934 г. быў арыштаваны і прыгавароны да вышэйшай меры пакарання. Пасля апеляцыі Вярхоўным судом СССР расстрэл заменены пазбаўленнем волі на 10 гадоў. Адбываў зняволенне ў Комі АССР. 29 верасня – 2 кастрычніка 1941 г. адбыўся паўторны суд. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 04.12.1941 г. Па першай і другой справе рэабілітаваны, адпаведна ў 1957 і 1958 гг.

З вершамі пачаў выступаць у 1924 г. (газета “Соха і молот”). Пачаў друкавацца ў 1925 г. Аўтар паэмы “Балота” (1927). Вершы змяшчаў у часопісах “Маладняк”, “Полымя”. Асобныя вершы С. Фаміна змешчаны ў 2-м томе “Анталогіі беларускай паэзіі” (1961), зборніку “Універсітэт паэтычны” (1971).

**Літаратура:**

**Аб жыцці і творчасці:**

Фамін Сяргей Уладзіміравіч// Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. — Мінск, 1985.— Т. 5.—С. 384.

Фамін Сяргей Уладзіміравіч: знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 542.

Фамін Сяргей Уладзіміравіч// Пісьменнікі Магілёўшчыны: бібліяграфічны паказальнік: складальнікі: Новікава Н.А., Катлёнак А.А.—Магілёў, 1993.—С. 220 — 221.

Сяргей Фамін// Пісьменнікі Савецкай Беларусі: кароткі даведальнік.—Мінск, 1931.—С. 347.

С. Фамін : аб С. Фаміне // Дзень паэзіі 1990.—С. 195.

Заёрка, А. Калі загінуў паэт/ А. Заёрка// Звязда.—1989.—20 кастрычніка.

Зарецкий, А. Что помнится: воспоминания о С. Фомине/ А. Зарецкий// Советский студент (Горки).—1989.—2 ноября.

Юрченко, Г. Дважды приговорённый/ Г. Юрченко// Нёман.—1991.—№8.—С. 117 — 118.

Юрчанка, Г. З Беларуссю заручоны/ Г. Юрчанка// Магілёўская праўда.—1992.—14 лютага; Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1988.—19 сакавіка.

Юрчанка, Г. Лёс паэта/ Г. Юрчанка // Ленінскі шлях (Горкі).—1989.—10 студзеня.

Юрчанка, Г. Не магу не пісаць.../ Г. Юрчанка// Ленінскі шлях (Горкі).—1991.—27 красавіка.

Юрчанка, Г. Неабходны ўдакладненні: з біяграфіі С. Фаміна // ЛІМ.—1991.—12 красавіка.—С. 7.

Юрчанка, Г. Недапетая песня/ Г. Юрчанка// Наша слова.—1992.—№19.—С. 4.

Юрчанка, Г. Пясняр маладосці/ Г. Юрчанка// Чырвоная Змена.—1990.—14 ліпеня.—С. 8.

Юрченко, Г. Судьба поэта/ Г. Юрченко// Сов. студент (Горки).—1989.—9 ноября.

Юрчанка, Г. Сяргей Фамін/ Г. Юрчанка// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1991.—27 красавіка.

Юрченко, Г. “Я, грежу именем твоим...”/ Г. Юрченко// Нёман.—1989.—№12.—С. 18 — 19.

**Творы і рэцэнзіі на іх:**

Вершы// Наша слова.—1992.—№19.—С. 4

Дымнае жыта: Вершы, паэмы, пераклады.—Мінск: Мастацкая літаратура, 1991.—138 с.

Рэц.: Аневіч А. Расстрэляны сталіністамі// ЛІМ.—1992.—10 студзеня.—С. 7.

Жураўлёў В. Жыццё агнём пацалавала... // Полымя.—1992.—№12.— С. 239 — 242.

Лянок В. На дымных шляхах// Чырвоная Змена.—1992.—16 сакавіка.— С. 10.

З паэзіі С. Фаміна// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1990.—13 чэрвеня.

"Прощай! Подходит час разлуки…»: На квадратах окон…»: Стихи// Нёман.—1991.—№8.—С. 117 — 118.

Развітанне: Верш// Анталогія беларускай паэзіі.—У 3-х т. Т. 2.—Мінск, 1961.—С. 443

Черные пни; Покос; Старый друг: Стихи// Нёман.—1989.—№12.— С. 19 — 22.

## Май

### 105 год з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай Працы, Гарнастаева Уладзіміра Савельевіча



Нарадзіўся 27.05.1921 г. у вёскі Колтава Мсціслаўскага раёна. Член КПСС з1944 г. Удзельнік Айчыннай вайны. У 1944–1954 гг. на партыйнай рабоце ў Мсціслаўскім раёне Магілёўскай вобласці. З лютага 1954 г. старшыня калгаса "Чырвоны Кастрычнік" Мсціслаўскага раёна. У 1966 годзе атрымаў званне Героя Сацыялістычнай Працы, узнагароджаны ордэнам "Знак Пашаны", медалямі.

**Літаратура:**

Гарнастаеў Уладзімір Савельевіч //Беларуская ССР: Кароткаяэнцыклапедыя.—1981.—Т. 5.—С. 150 — 151.

Гарнастаеў Уладзімір Савельевіч: Героі Сацыялістычнай Працы// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 497.

Анюков, М.Н. Трудная должность/ М.Н. Анюков // Дела их золотом горят.—Минск, 1976.—С. 195 — 203.

Анюкоў, М. Цяжкая пасада/ М. Анюкоў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1976.—14 лютага.

Гільбурд, Б. Вялікі клопат / Б. Гільбурд // Магілёўская праўда.— 1965.—14 красавіка.

З позіркам у заўтра // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1975.—11 кастрычніка.

Цімафееў, І. Раніца старшыні/ І. Цімафееў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1965.—9 сакавіка.

Яшкін, П. Слова пра камуніста / П. Яшкін // Магілёўская праўда.—1963.—4 верасня.

## 90 год з дня нараджэння літаратуразнаўца, Жураўлёва Васіля Пракопавіча



Нарадзіўся 27.5.1931 г. у в. Раздзел 2-гі Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1954 г. скончыў філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага і паступіў у аспірантуру пры гэтым жа інстытуце. З 1956 г. – навуковы супрацоўнік інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук.

Выступае ў друку ў жанры крытыкі і літаратуразнаўства з 1956 г. Адзін з аўтараў "Гісторыі беларускай савецкай літаратуры" т. 1-2 (1964–1966). "Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры" т.2 (1969). "История белорусской дооктябрьской литературы" (1977). Сааўтар калектыўных прац "Праблемы сучаснай беларускай прозы" (разам з П. Дзюбайлам і М. Луферавым, 1967). "Пытанні паэтыкі" (разам з Я. Шпакоўскім і А. Яскевічам, 1974), аўтар манаграфіі " Структура твора" (1978).

**Літаратура:**

**Аб жыцці і творчасці:**


Жураўлёў Васіль Пракопавіч// Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. — Мінск, 1985.— Т. 2.—С. 444.

Жураўлёў Васіль// Беларускія пісьменнікі: бібліяграфічны слоўнік : у 6 т. —Мінск, 1993.—Т. 2. — С. 453 — 454.

Жураўлёў Васіль// Пісьменнікі Магілёўшчыны: бібліяграфічны паказальнік: складальнікі: Новікава Н.А., Катлёнак А.А.—Магілёў, 1993.—С. 78, 79, 166, 221, 226.

Жураўлёў Васіль Пракопавіч: знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 528 — 529.

Васіль Жураўлёў// Пісьменнікі Савецкай Беларусі : кароткі даведальнік. —Мінск, 1981.— С. 135 — 136.

Лазарук, М. Часу непадуладнае/ М. Лазарук.—Мінск, 1981. — С. 129 — 130.

Лаўшук, С. У пастаянных клопатах: да 60-годдзя крытыка і літаратуразнаўца В. Жураўлёва/ С. Лаўшук// ЛІМ.—1991.—24 мая.—С. 11.

**Творы і рэцэнзіі на іх:**

Магчымасць рэалізму: Прычыны і гістарызм.—Мінск: Навука і тэхніка, 1982.—232 с.

Пытанні паэтыкі.—Мінск: Навука і тэхніка, 1974.—221 с.

Структура твора : Рух сюжэтна–кампазіцыйных форм.—Мінск: Навука і тэхніка, 1978.—311с.

Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана.—Мінск : Навука і тэхніка, 1991.—205 с.

## Чэрвень

### 115 год з дня нараджэння пісьменніка, Сапрыкі Ганны Іосіфаўны



Нарадзілася 3 чэрвеня 1911 г. у в. Куркаўшчына Мсціслаўскага раёна. Скончыла Мсціслаўскі педагагічны тэхнікум у 1930 г., Беларускі вышэйшы педагагічны інстытут (1933). Працавала ў Беларускім дзяржаўным выдавецтве (1933–1962 гг.). Пачала друкавацца ў 1928 г. Аўтар кнігі прозы “Калі ў сэрцы вясна” (1959). На беларускую мову пераклала “Апавяданні кітайскіх пісьменнікаў” (1953), творы ўкраінскіх і рускіх пісьменнікаў (“З крыжом ці з нажом” Я. Галана (1954); “Раённыя будні” В. Авечкін (1958); “Мой памочнік Карсыбек” М. Вірты (1961) і інш.).

Памёрла 14 мая 1962 г.

**Літаратура:**

**Аб жыцці і творчасці:**

Сапрыка Ганна Іосіфаўна// Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. — Мінск, 1987.— Т. 4.—С. 644.

Сапрыка Ганна Іосіфаўна: знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 539.

Сапрыка Ганна Іосіфаўна// Пісьменнікі Магілёўшчыны: бібліяграфічны паказальнік: складальнікі: Новікава Н.А., Катлёнак А.А.—Магілёў, 1993.—С. 201.

Ганна Сапрыка// Пісьменнікі Савецкай Беларусі: кароткі даведальнік.—Мінск, 1981.—С. 311.

Войцянкоў, Н. Ганна Сапрыка/ Н. Войценкаў// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1966.—26 красавіка.

Войценкаў, М. Мсціслаўскія "маладнякоўцы"/ М. Войценкаў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1986.—11, 14, 18 кастрычніка.

Клімуць, Я. Ганна Сапрыка/ Я. Клімуць// Магілёўская. праўда.—1991.—26 студзеня.—(Анталогія літаратурнай Магілёўшчыны).

Курбека, І. 75 гадоў з дня нараджэння Г. Сапрыка/ І. Курбека// Полымя.—1986.—№6.—С. 223 — 224.

Юрчанка, Г. Калі ў сэрцы вясна/ Г. Юрчанка// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1979.—4 кастрычніка.

**Творы і рэцэнзіі на іх:**

Калі ў сэрцы вясна: Апавяданні і аповесці.—Мінск: Дзяржвыдавецтва БССР, 1959.—184 с.

Рэцэнція: Буран, В. Шаблон — небяспека для пісьменніка/ В. Буран// ЛІМ.—1960.—2 красавіка.—С.3.

## Ліпень

### 65 год з дня нараджэння кіраўніка ААТ "Кастрычнік" Лаўнікава Пятра Сцяпанавіча

Нарадзіўся 12 ліпеня 1961 г. У 2007 г. Пётр Сцяпанавіч быў лаўрэатам спецыяльнай прэміі Магілёўскага абліспалкама "Чалавек года". У 2015 г. указам Прэзідента Рэспублікі Беларусь узнагароджаны медалью "За працавітыя поспехі". У 2021 г. Пётр Сцяпанавіч узнагароджаны высокай дзяржаўнай наградай за працавітыя дасягнанні — ордэн Пашаны.

### 75 год з дня нараджэння вучонага ў галіне радыёэлектронікі, кандыдата тэхнічных навук, дацэнта, Ільянкова Валерыя Андрэевіча

Нарадзіўся 12 ліпеня 1951 г. у в. Шамава Мсціслаўскага раёна**.** Вучоны ў галіне радыёэлектронікі, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт. Спачатку вучыўся ў мясцовай сярэдняй школе, затым у СШ №16 Магілёва, дзе ў 1968 г. скончыў 10 класаў. У гэтым жа годзе паступіў на 1-ы курс Мінскага радыётэхнічнага інстытута, а ў 1973 г. атрымаў дыплом радыёінжынера па спецыяльнасці "Радыётэхніка" і быў пакінуты на рабоце ў інстытуце. У 1977 –1980 гг. вучыўся ў аспірантуры пры МРТІ. У 1984 г. абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук. З 1973 па 1990 г. працаваў у МРТІ інжынерам, старшым інжынерам, малодшым і старшым навуковым супрацоўнікам. У 1990 г. перайшоў на выкладчыцкую работу і пасля выбрання па конкурсу з'яўляецца дацэнтам кафедры

тэлекамунікацыйных сістэм МРТІ, а з лістапада 1993г. – Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі. Мае 80 навуковых прац, у тым ліку 12 вынаходстваў. Працуе над праблемай стварэння аптымальных метадаў і сістэм перадачы тэлевізійных сігналаў.

**Літаратура:**

Ільянкоў Валерый Андрэевіч: знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.— С. 529 — 530.

## 95 год з дня нараджэння Заслужанага настаўніка БССР, Карпечкіна Сцяпана Ігнатавіча



Нарадзіўся 19 ліпеня 1931 г. у в. Беразуйкі Мсціслаўскага раёна ў сям'і калгаснікаў. У 1951 г. скончыў Мсціслаўскае педагагічнае вучылішча, працаваў у Ваўкавыскім раёне Гродзенскай вобласці настаўнікам і дырэктарам сямігадовай школы. Працу спалучаў з вучобай у БДУ імя Леніна на гістарычным факультэце, які закончыў у 1959 г. Працаваў у Мсціслаўскім раёне дырэктарам Віхранскай сямігадовай і Ануфрыўскай сярэдняй школах. З 1960г. – загадчык раённага аддзела народнай асветы. У 1964 г. узнагароджаны значком «Выдатнік народнай асветы БССР". Званне "Заслужаны настаўнік БССР" прысвоена ў 1966 г. З 1969 г. на партыйнай рабоце: другі сакратар Мсціслаўскага РК КПБ, з 1975 г. –загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў Магілёўскага абкома КПБ. Узнагароджаны ордэнам "Знак Пашаны" (1974), дзвюма медалямі "За працоўную доблесць" (1960, 1971), юбілейным медалём "За доблестную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна" (1970).

Трагічна загінуў 11 лістапада 1986 г.

**Літаратура:**

Карпечкін Сцяпан Ігнатавіч: заслужаныя настаўнікі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 512.

## 110 год з дня нараджэння Заслужанага ўрача БССР, Дубіцкай Ганны Емяльянаўны

Нарадзілася 23 ліпеня 1916 г. у в. Доўгавічы Мсціслаўскага павета ў сялянскай сям'і. Скончыла медыцынскі рабфак у Барысаве, у 1940 г. – Мінскі медыцынскі інстытут. Працавала загадчыцай Доўгавіцкай бальніцы. З 1943 г. працавала загадчыцай Доўгавіцкага, а з 1945 г. Шыркаўскага ўрачэбнага ўчастка, з 1951 г. зноў загадчыцай Доўгавіцкага ўрачэбнага ўчастка (да 1976 г. ). Званне "Заслужаны ўрач БССР" прысвоена ў 1966 г.

**Літаратура:**

Дубіцкая Ганна Емельянаўна: заслужаныя ўрачы// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 515.

## Верасень

### 115 год з дня нараджэння Беларускага паэта, Таўбіна Юлія Абрамавіча



Нарадзіўся 15 верасня 1911 г. у г. Астрагожску Варонежскай вобласці. Беларускі паэт.

У 1911 г. разам з бацькамі пераехаў у Мсціслаў. Скончыў Мсціслаўскі педагагічны тэхнікум. Вычыўся ў БДУ. З 1933 г. арыштаваны і пазасудовымі органамі прыгавораны да двух гадоў высылкі ў Цюмень. У 1936 г. арыштаваны другі раз (відаць пасля вяртання ў Мінск). Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда ад 29 кастрычніка 1937 г. прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Па першай і другой справе рэабілітаваны, адпаведна ў 1956 і 1957 гг.

30 кастрычніка 1937 г. яго жыццё абарвалася. Ю. Таўбін – адзін з ахвяр сталінізму на Беларусі.

Пачаў друкавацца з 1926 г. Аўтар зборніка паэзіі "Агні" (1930), "Каб жыць, спяваць і не старэць..." (1931), "Тры паэмы" (1931), "Мая другая кніга" (1932).

Перакладаў на беларускую мову асобныя творы Г. Гейнэ, У. Маякоўскага, а таксама англамоўных паэтаў.

**Літаратура:**

**Аб жыцці і творчасці:**

Таўбін Юлій Абрамавіч// Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. — Мінск, 1987.— Т. 5.—С. 249.

Таўбін Юлій Абрамавіч: знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 540 — 541.

Таўбін Юлій Абрамавіч// Пісьменнікі Магілёўшчыны: бібліяграфічны паказальнік: складальнікі: Новікава Н.А., Катлёнак А.А.—Магілёў, 1993.—С. 213 — 214.

Юлій Таўбін// Пісьменнікі Савецкай Беларусі: кароткі даведальнік.—Мінск, 1981.—С. 339 — 340.

Бярозкін, Р. Пра Юлія Таўбіна/ Р. Бярозкін// Бярозкін, Р. Постаці: артыкулы пра паэтаў/ Р. Бярозкін.—Мінск, 1971.— С. 165 — 193.

Бярозкін, Р. Пра Юлія Таўбіна/ Р. Бярозкін// Бярозкін, Р. Кніга пра паэзію/ Р. Бярозкін.—Мінск, 1974.— С. 279 — 319.

Грахоўскі, С.І. Жывуць у памяці маёй : успаміны пра паэтаў Юлія Таўбіна і Алеся Розну/ С.І. Грахоўскі// Грахоўскі, С.І. Так і было/ С.І. Грахоўскі.— Мінск, 1986.— С. 123 — 128.

Зарыцкі, А.А. За словам – падарункам/ А.А. Зарыцкі.—Мінск, 1985.—С. 7 — 77.

Клімуць, Я. Юлі Таўбін/ Я. Клімуць// Магілёўская праўда.—1990.—27 студзеня.

Куляшоў, А.А. Маналог: памяці паэтаў З. Астапенкі і Ю. Таўбіна/ А.А. Куляшоў// Куляшоў, А.А. Маналог: Вершы, паэмы/ А.А. Куляшоў.—Мінск, 1989.—С. 9 — 21.

Духанін, М. Маналог: адвольны працяг паэмы А. Куляшова ў памяць сяброў–паэтаў Ю. Таўбіна і З. Астапенкі/ М. Духанін // Маладосць.—1979.—№5.—С. 73 — 85.

Лужанін, М. Маналог: Паэма (прысвечанная Ю. Таўбіну і З. Астапенку)/ М. Лужанін // Лужанін, М. Галасы над выраем: кнігапаэзіі/ М. Лужанін.—Мінск, 1980.—С. 96 — 109.

Духанін, М. Юлька і Змітрок/ М. Духанін// Лужанін, М. Трое: Аповесці, апавяданні, эсэ/ М. Лужанін.—Мінск, 1939.—С. 389 — 395.

Мішчанчук, М.І. “Мы помнім эпоху лістовак, мы духам падпольным жывём”/ М.І. Мішчанчук// Мішчанчук, М.І. Беларуская савецкая паэзія 20-х гадоў/ М.І. Мішчанчук.—Мінск, 1988.— С. 111 — 127.

Сакалоўскі, У. Невядомыя пераклады Юлія Таўбіна/ У. Сакалоўскі// Шляхам гадоў: гісторыка- літаратурны зборнік.—Мінск, 1990.—Вып. 2.—С. 223 — 227.

Шушкевич, С. История одного стихотворения : Ю. Таубина “Тэдди”, посвященного З. Тельману/ С. Шушкевич// Знамя юности.—1986.—8 июня.—(Далёкое–близкое).

Шушкевіч, С. Слядамі паэта/ С. Шушкевіч// Полымя.—1968.—№1.—С. 230 — 233.

Юрчанка, Г. З “Мсціслаўскае плеяды”/ Г. Юрчанка// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1978.—17 кастрычніка.

15 верасня – 80 год з дня нараджэння Ю.А. Таўбіна (1911–1937), беларускага савецкага паэта: рэкамендацыйныспіс// Новыя кнігі БССР.—1991.—№8.— С. 16 — 17.

**Творы і рэцэнзіі на іх:**

Выбраныя вершы.—Мінск: Дзяржвыд БССР, 1957.—102 с.

Вершы.—Мінск: Беларусь, 1969.—150 с.—(Бібліятэка беларускай паэзіі).

Гейнэ, Г. Вершы: пераvод Ю. Таўбіна/ Г. Гейнэ /Шляхам гадоў: Гісторыка- літаратурны зборнік.—Мінск, 1990.—Вып. 2.— С. 228 — 245.

Мой махнаты Дунай б’е хвастом ля парога; Падсумак; Нехта борзды і шыбкі; Пра клён; Смерць: вершы// Анталогія беларускай паэзіі : у 3-х т.—Мінск, 1981.—Т. 2. — С. 521 — 524.

## Кастрычнік

### 70 год з дня нараджэння настаўніка рускай мовы і літаратуры Пруднікавай Галіны Паўлаўны

Нарадзілась 21. 10. 1956 г. Узнагароджана нагрудным знакам “Выдатнік адукацыі”.

## Лістапад

### 120 год з дня нараджэння кіраўніка партызанскага руху ў Магілёўскай вобласці, Вайстрова Дзмітрыя Фёдаравіча

Нарадзіўся 7 лістапада 1906 г. у в. Добрая Горацкага павета. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Магілёўскай вобласці. З 1930 г. на партыйнай рабоце. У пачатку Айчыннай вайны пакінуты ў тыле ворага. У партызанах з кастрычніка 1941 г., з лютага 1942 г. камандзір групы, атрада, у верасні–кастрычніку 1942 г. в. а. камандзіра брыгады, у кастрычніку 1942–сакавіку 1943 г. камандзір партызанскага атрада, са жніўня 1943 г. член Мсціслаўскага падпольнага РК КП(б)Б, у студзені–чэрвені 1944 г. камісар 61-ай партызанскай брыгады. У 1944–1957 гг. на партыйнай, савецкай і гаспадарчай рабоце. Аўтар кнігі “У Горацкім рэдкалессі” (1986).

**Літаратура:**

Партызанскія камандзіры. Вайстроў Дзмітрый Фёдаравіч // Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 207.

**135 гадоў з дня нараджэння Доктара тэхнічных навук, Далецкага Рыгора Феліксавіча**

Нарадзіўся 26 лістапада 1891г.Доктар тэхнічных навук.

Дзіцячыя гады прайшлі ў в. Кудрычы Мсціслаўскага павета ў сям'і бацькоў. Вучыўся ў Магілёве, Вільні, экстэрнам здаў экзамены за поўны курс пры Рослаўскай гімназіі. У 1912 г. скончыў прыродазнаўчае аддзяленне фізіка-матэматычнага факультэта Маскоўскага ўніверсытэта. У час вучобы працаваў асістэнтам пры кафедры хіміі ў Маскоўскім вышэйшым жаночым інстытуце, выкладаў у політэхнікуме, выконваў абавязкі асістэнта пры кафедры хіміі ва ўніверсітэце. З восені 1918 г. у Мсціславе выкладчык хіміі і біялогіі на педагагічных курсах. З 1922 г. у Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце – выкладчык арганічнай і агульнай хіміі. Сумесна з прафесарам Б. Мажароўскім праводзіў геалагічнае абследванне ваколіц Мсціслава. З 1925 г. у Ленінградзе – выкладчык фізікі ў сярэдняй школе і ў тэхнічным і электрафізічным інстытутах. З 1935 г. у Саратаве працаваў у вышэйшых навучальных установах, абараніў кандыдацкую дысертацыю, быў зацвярджаны ў званні дацэнта на кафедры неарганічнай хіміі ўніверсытэта.

У гады Вялікай Айчынай вайны працаваў па абарончай тэматыцы. З 1951 г. у Мічурынску – загадчык кафедры фізікі ў Плодаагароднінным інстытуце. У дасканаласці валодаў нямецкай, англіскай і французскай мовамі. Р.Ф. Далецкі аўтар 50 прац і 3 вынаходніцтваў .

З 1961 г. па стану здароўя не працаваў.

Памёр у 1965 г.

**Літаратура:**

Далецкі Рыгор Феліксавіч: знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 527.

**Снежань**

**70 год з дня нараджэння начальніка інспекцыі МНС па Мсціслаўскаму раёну Фядосавай Зоі Александраўны**

Нарадзілася 4снежня 1956г.

**250 год з дня нараджэння філосафа, Доўгірда Анёла**

Нарадзіўся 02.12.1776. Маёнтак Юркаўшчына, Мсціслаўскага павета. Памёр 26.04.1835. Філосаф. З 1786 г. вучыўся ў езуіцкай школе ў Мсціславе, потым у Магілёве, дзе паказаў выдатныя здольнасці. Працягваў навучанне ў

Дубровенскай школе піяраў, дзе вывучаў рыторыку, логіку, фізіку, гісторыю, лацінскую і французскую мовы. У 1791 г. падлетак уступіў у ордэн піяраў на Валыншчыне, потым у настаўніцкай семінарыі, рыхтуючыся да выкладчыцкай дзейнасці. З 1971 па 1807 г. выкладаў матэматыку, фізіку і рыторыку ў піярскіх школах у Лідзе, Віцебску, Шчучыне. У 1807 г. пераехаў у Вільню і стаў працаваць у Галоўнай духоўнай семінарыі пры Віленскім універсітэце. З 1809 г. выконваў абавязкі капелана, а ў 1816 г. прызначаецца капеланам Галоўнай Духоўнай семінарыі. З 1818 па 1832 г. чытаў лекцыі па логіцы, псіхалогіі і філасофіі ў Віленскім універсітэце. Пасля закрыцця ўніверсітэта яго прызначылі віленскім канонікам, а з 1834 г. працаваў прафесарам Духоўнай семінарыі. Напісаў даследванне па філасофіі Канта (1814 г., рукапіс не знойдзены). У 1826 г. напісаў доктарскую дысертацыю (Тэалагічна-дыягнастычная дысертацыя пра цуды). Прыхільнік поглядаў Дж. Лока і Э. Кандыльяка (распрацоўвалі эмпірыстычную тэорыю), якія спалучаў з аб'ектыўным ідэалізмам. Матэрыялістычныя моманты светаўспрымання выявіліся галоўным чынам у тэорыі пазнання (прыняцця аб'ектыўнага свету, які ўздзейнічае на органы пачуццяў, законаў і фактараў прыродаўства, як галоўных крытэрыяў ісціны, адмаўленне прыроджаных ідэй). Захапляўся паэзіяй, пісаў вершы, цікавіўся эстэтыкай і крытыкай. Прапаноўваў Віленскаму ўніверсітэту план выкладання эстэтыкі, падзяліў яе на агульную (тэарытычную), прыватную (крытыка) і лінгвістычную (аналіз мовы). Даследваў ролю ўяўлення і фантазіі ў творчасці наогул і ў мастацтве ў прыватнасці. Дыферэнцыраваў два віды пазнання рэчаіснасці: мастацкі і філасофскі. Лічыў, што мастацкія ўяўленні залежаць ад узроўню цывілізацыі.

**Літаратура:**

Доўгірд Анёл : філосаф // Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 78.

## 125 год з дня нараджэння Доктара медыцынскіх навук, прафесара, Шыфрына Арона Рафаілавіча



Нарадзіўся 23 снежня 1901 г. у Мсціславе ў сям'і рамесніка. Доктар медыцынскіх навук, прафесар.

У 1915 г. бацькі пераехалі ў Томск. У 1925 г. скончыў медыцынскі факультэт Томскага Дзяржаўнага ўніверсітэта. Да 1936 г. працаваў урачом дэрмата-венеролагам у Томску, Новасібірску, Анжэра-Суджанску . У 1936–1941 гг. працаваў у Варонежы ў медінстытуце навуковым супрацоўнікам, абараніў кандыдацкую дысертацыю (1941). У ліпені 1941–1943 гг. у Савецкай Арміі на Варонежскім і Сталінградскіх франтах – начальнік шпіталя, намеснік начальніка па медыцынскай частцы.

З 1944 г. у Яраслаўлі: асістэнт, дацэнт (1946) медыцынскага інстытута, з 1953 г. – загадчык кафедры скураных і венералагічных захворванняў. У 1959 г. абараніў доктарскую дысертацыю, прафесар. З 1961 па 1971 г. у Станіслаўскім (зараз Івана-Франкаўскім) медыцынскім інстытуце, загадчык кафедры. Напісаў 39 навуковых прац, 29 з іх апублікаваў. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

**Літаратура:**

Шыфрын Арон Рафаілавіч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 543.

## 90 год з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай працы, Давыдзенкі Уладзіміра Адамавіча



Нарадзіўся ў 1936 г. у в. Тышча Мсціслаўскага раёна ў сялянскай сям'і. Скончыў сярэднюю школу. Працоўную дзейнасць пачаў у 1955 г. загадчыкам Доўгавіцкага сельскага клуба. У тым жа годзе паступіў у Беларускую сельскагаспадарчую Акадэмію, якую скончыў у 1960 г. Працаваў галоўным аграномам калгаса “21 з'езд КПСС” Мсціслаўскага раёна. З 1978 г. – начальнік вытворчага ўчастка гэтага калгаса.

За поспехі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці і выкананне пяцігадовых планаў па продажу прадуктаў земляробства і жывёлагадоўлі ўзнагароджаны ордэнамі Леніна (1971), “Знак Пашаны” (1966).

**Літаратура:**

Давыдзенка Уладзімір Адамавіч: узнагароджаны ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.— С. 502 — 503.

## 105 год з дня нараджэння Сакратара падпольнага міжрайкама камсамола па Мінскай вобласці, Іўкіна Якава Іосіфавіча



Нарадзіўся ў 1921 г. у в. Курманава Мсціслаўскага павета. Сакратар падпольнага міжрайкама камсамола па Мінскай вобл. У айчынную вайну скончыў Мсціслаўскае педвучылішча ў 1939 г. З 1940 г. у Чырвонай Арміі, скончыў Ленінградскае вучылішча сувязі ў 1941 г. і быў прызначаны камандзірам узвода 45-га асобнага батальёна сувязі па падрыхтоўцы

радыстаў на фронт. А калі пачаўсяпартызанскі рух у тыле ворага, добраахвотна даў згоду пайсці ваяваць у тыл ворага.

У 1942 г. закончыў у Маскве спецшколу, дзе вучылі тактыцы партызанскай вайны, правілам канспірацыі, дыверсійнай справе, уменню валодаць рознымі відамі зброі. У красавіку 1942 г. па рашэнні ЦКЛКСМБ быў накіраваны сакратаром міжрайкама камсамола на падпольную работу ў Мінск і Мінскую вобл.

Праз Віцебскія вароты група перайшла ў тыл ворага да мястэчка Мсціж Бягомльскага раёна. Але фашысты высачылі камсамольцаў. Пачаўся бой, у якім загінулі члены міжрайкама.

Сакратар падпольнага міжрайкама Я. І. Іўкін застаўся адзін. Прыйшлося працаваць днём і ноччу. Ім былі створаны райкам камсамола, пярвічныя камсамольскія арганізацыі ў партызанскіх брыгадах, атрадах Мінскай вобласці, удзельнічаў у баявых аперацыях.

Пазней накіраваны ў Магілёўскі абкам камсамола інструктарам па ваеннай рабоце, дзе працаваў з красавіка 1944 па красавік 1946 г. Пасля з'яўляўся сакратаром Дрыбінскага райкама камсамола. Па сканчэнні Рэспубліканскай партыйнай школы пры ЦККП(б)Б у 1950 г. – у Мсціслаўскім раёне на партыйнай рабоце: загадчык арганізацыйнага аддзелу і сакратар РККП(б)Б, старшыня калгаса "Чырвоная зорка", старшыня раённага камітэта народнага кантролю, інспектар дзяржаўнага камітэта БССР па ахове прыроды.

За баявыя і працоўныя подзвігі ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1 ступені, Чырвонай зоркі, медалём "Партызану Айчыннай вайны" 1 ступені, трыма медалямі "За працоўную адзнаку".

Памёр 19 красавіка 1996 г.

**Літаратура:**

Іўкін Якаў Іосіфавіч: партызанскія камандзіры// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 207.

## 375 год з дня нараджэння асветніка, перакладчыка, кнігавыдаўца, паэта, Капіевіча (Капіеўскі) Ільі Фёдаравіча

Нарадзіўся ў 1651 г. (?), памёр на Мсціслаўшчыне ў 1714 г., асветнік, перакладчык, кнігавыдавец, паэт. Скончыў Слуцкую кальвініслую школу. З прычыны зямельных спрэчак з езуітамі выехаў у Галандыю, дзе працаваў у друкарні. У 1700 г. у Амстэрдаме заснаваў уласную друкарню. Тут ён знаёміцца з маладым Пятром 1. па даручэнні цара Капіевіч падрыхтаваў і выдаў у 1699 г. у Амстэрдаме першы дапаможнік па матэматыцы на рускай мове: "Краткое и полезное руководение во арифметику". З пачатку 18 ст.

жыў у Маскве, працаваў у Польскім прыказе. Мяркуюць, што ўдзельнічаў у падрыхтоўцы рэформы рускага пісьма 1708 г. Пятра 1, узораў новых шрыфтоў. Прапагандаваў свецкія навукі, садзейнічаў развіццю асветы і распаўсюджванню навуковых ведаў у Расіі. Перапісваўся з Г. Лейбніцам (перапіска захоўваецца ў Германіі). Ілья Капіевіч выдае першыя рускамоўныя падручнікі па граматыцы, рыторыцы ды іншыя (напісаў "Рыторыку" і "Паэтыку"). З 1699 па 1706 г. склаў і выдаў каля 20 кніг, у тым ліку "Введение краткое во всякую историю...", "Уготование и толкование ясное поверстание кругов небесных" (усе 1699 г.). Яго значэнне для рускай пісьменнасці адзначыў А. Пушкін. Светапогляд Капіевіча па духу рэнесансавы. Мастацтва, на яго думку, абавязана ўслаўляць добрыя справы ў "бясконцыя вякі".

**Літаратура:**

Капіевіч (Капіеўскі) Ілья Фёдаравіч: звязаў іх лёс з Мсціслаўшчынай// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С.79.

## 95 год з дня нараджэння Беларускага жывапісца і графіка, Лісоўскага Міхаіла Якаўлевіча

Нарадзіўся ў 1931 годзе, ў вёскі Белы Мох Мсціслаўскага раёна. Беларускі жывапісец і графік. У 1960 г. скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. У мастацкіх выстаўках удзельнічаў з 1960 г.. Працаваў ужанрах партрэта, бытавым, станковай графіцы. Асноўныя творы ў жывапісе: "Настаўніца" (1960), партрэты беларускіх пісьменнікаў Я.Брыля, Я. Семяжона (1967), Ніла Гілевіча (1968) і інш. Жывапісныя работы вызначаюцца рэалістычнай трактоўкай формы, багаццем каларыту, псіхалагізмам вобразаў. Аўтар шматлікіх карыкатур і сяброўскіх шаржаў на тэмы культурнага жыцця Беларусі. У 1971 г. выдадзены асобным альбомам "Няўрокам кажучы". Малюнкі вылучаюцца дакладнасцю і вастрынёй характарыстык, умелым скарыстаннем гіпербалы як сродкаў сатырычнай тыпазіцыі.

Памер у 1970 годзе.

**Літаратура:**

**Аб жыцці і творчасці:**

Міхаіл Якаўлевіч Лісоўскі// Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. — Мінск, 1987.— Т. 3.—С. 266.

Лісоўскі Міхаіл Якаўлевіч: Знакамітыя людзі// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 534.

Михаил Яковлевич Лисовский// Художники советской Белоруссии.—Минск,1976.—С. 210.

Лісоўскі Міхаіл Якаўлевіч// Дзеячы выяўленчага мастацтва Магілёўшчыны: бібліяграфічны паказальнік; складальнік Цыбулёва Н.—Магілёў, 1993.—С. 31.

Лісоўскі М. Я. Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Т. 5: 1941-да 60-х гг./Рэдкалегія і кал.: С.В. Марцэлеў і інш.—Мінск: Навука і тэхніка, 1992.Т. 5.—С. 113.

Дробов, Л.Н. Живопись советской Белоруссии/ Л.Н. Дробов.—Мінск : Вышэйшая школа, 1979.—301 с. (аб ім гл. с.: 171, 237, 241, 245).

Шматаў, В.Ф. Беларуская сатырычная графіка/ В.Ф. Шматаў.—Мінск.: Навука і тэхніка, 1971.—143 с. (аб ім гл. с. 135 — 137).

Гончарова, Л. Художник Лисовский/ Л. Гончарова// Нёман.—1979.—№12.—С. 7.

Юрчанка, Г. Мастак непаўторнага таленту/ Г. Юрчанка// Святло Кастрычніка (Мсціслаў).—1978.—17 чэрвеня.

**85 год з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай працы, Маргунова Уладзіміра Ксенафонтавіча**



Нарадзіўся ў 1936 г. у г. Быхаве Магілёўскай вобласці. З 1952 г. – рабочы саўгаса "Перамога" Мсціслаўскага раёна. З верасня 1955 г. служыў у савецкай Арміі. У 1957 г. зволіўся. Скончыў Мсціслаўскае сельскае ПТВ. Працаваў камбайнёрам, палявым аб'ездчыкам саўгаса "Перамога". Завочна скончыў Жыліцкі саўгас-тэхнікум і ў 1970 г. быў прызначаны памочнікам начальніка вытворчага аб'яднання саўгаса. З 1980 г. брыгадзір комплекснай брыгады, з 1988 г. – старшыня гасраліковага падраздялення саўгаса, затым калгаса "70 год БССР".

За шматгадовую добрасумленную працу ў павелічэнні вытворчасці прадуктаў земляробства ўзнагароджаны ордэнамі Леніна (1973), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1972).

**Літаратура:**

Маргуноў Уладзімір Ксенафонтавіч: Узнагароджаны ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі р-н: Гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі.—Мн., 1999.—С. 505.

## 110 год з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай працы, Нікіценкі Надзеі Данілаўны



Нарадзілася ў 1911 г. у в. Парадзіна Мсціслаўскага павета ў сялянскай сям'і. Скончыла мясцовую пачатковую школу. З 1931 г. – калгасніца калгаса "Чырвонаармеец". Пасля вызвалення раёна працавала калгасніцай калгаса "Чырвонаармеец", а з 1950 г. – свінаркай калгаса "21 з'езд КПСС".

У 1966 г. за поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі, павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак мяса і іншай прадукцыі ўзнагароджана ордэнам Леніна.

Памёрла ў 2000 г.

**Літаратура:**

Нікіценка Надзея Данілаўна: Узнагароджаны ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі р-н: Гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі.—Мн., 1999.—С. 506.

## 90 год з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай працы, Пацанковай Надзеі Андрэеўны

Нарадзілася ў 1931 г. у в. Парадзіна Мсціслаўскага раёна ў сям'і калгасніка. Пасля заканчэння мясцовай сямігодкі пайшла працаваць у паляводчую брыгаду. З 1947 г. – калгасніца калгаса "1 Мая". З 1960 г. працавала на жывёлагадочай ферме цялятніцай. Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

У 1966 г. за дасягнутыя поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі, павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак мяса ўзнагароджана ордэнам Леніна.

**Літаратура:**

Пацанкова Надзея Андрэеўна: Узнагароджаны ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 506.

## 85 год з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай працы, Саханкова Барыса Сяргеевіча



Нарадзіўся ў 1936 г. у в. Людагошча Мсціслаўскага раёна ў сялянскай сям'і. Скончыў 6 класаў Ануфрыеўскай сямігадовай школы. З 1950 г. – калгаснік калгаса "Чырвоны Кастрычнік".

У 1955 г. прызваны ў армію. Пасля звальнення ў запас у 1958 г. працаваў у калгасе “21 з’езд КПСС”, з 1959 г. – брыгадзірам паляводчай брыгады. Пасля заканчэння Мсціслаўскага сельскага прафесіянальнага вучылішча ў 1973 г. працаваў трактарыстам у гэтым калгасе. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1976), Кастрычніцкай рэвалюцыі (1971).

**Літаратура:**

Саханкоў Барыс Сяргеевіч: Узнагароджаны ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С. 507.

## 90 год з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай працы, Скальзкова Мікалая Уладзіміравіча



Нарадзіўся ў 1931 г. у в. Івакава Гагінскага раёна Горкаўскай вобласці ў сялянскай сям’і. У 1952 г. скончыў Вятошкінскі сельскагаспадарчы тэхнікум. Пасля яго заканчэння працаваў старшым заатэхнікам аддзела сельскай гаспадаркі Разінскага райвыканкама Горкаўскай вобласці. У 1954 г. быў накіраваны ў Мсціслаўскі раён і прызначаны галоўным заатэхнікам Хлышчоўскай МТС. У 1958 г. прызначаны галоўным заатэхнікам саўгаса “Ленінскі шлях” Касцюковіцкага раёна. З 1959 г. працаваў у Мсціслаўскім раёне дырэктарам саўгаса “Пісараўшчына”, вучыўся завочна ў Горкаўскім сельскагаспадарчым інстытуце, які скончыў у 1962 г.

У 1973 г. прызначаны начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі райвыканкама, з 1986 г. – старшыня камітэта народнага кантролю.

За поспехі ў развіцці жывёлагадоўлі, павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак мяса, малака і іншай прадукцыі ўзнагароджаны ордэнамі Леніна (1966), Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1971), двума “Знак Пашаны” (1973, 1978), дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР (1969, 1981).

**Літаратура:**

Скальзкоў Мікалай Мікалаевіч: узнагароджаны ордэнам Леніна// Памяць: Мсціслаўскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі.—Мінск, 1999.—С.507.

## З гісторыі вёсак

З нагоды юбілеяў вёсак раім аформіць бібліятэчныя выставы, тэматычныя паліцы на тэмы: “Гісторыя і сучаснасць роднага краю”, “Ён Радзімаю завецца-непаўторны гэты край”, “Край, дзе мы жывём”, “Каранямі я з роднай зямлі”, “Вёска, у якой я жыву”, “Зямля бацькоў – жыцця крыніца”, “Зямля, дзе пачаўся наш лёс”, “Вёска мая, я часцінка твая”, “Непаўторная, адзіная, малая Радзіма”, “Зямля бацькоў – зямля святая”, “Я вырас тут, і край мне гэты любы” і інш.

Падрыхтаваць мерапрыемствы, гадзіны знаёмстваў, краязнаўчыя гадзіны, урокі пазнання, урокі бацькаўшчыны, краязнаўчыя вандроўкі на тэмы: “Знакамітыя людзі нашай вёскі”, “Ці ведаеш ты сваю вёску?”, “За што я люблю сваю вёску”, “Тут табе пашчасціла жыць і нарадзіцца”, “ Наша малая радзіма-роднае сяло”, “Мой родны, мілы край”, “Край бацькоўскі – мая глабінка”, “Наша вёска раней і зараз”, “Зямля іх наша ўзгадавала” і інш.

**АСІНАЎКА** — вёска ў Падсолтаўскім с/с , за 28 км на З ад Мсціслава, 123 км ад Магілёва, 10 км ад чыг. станцыі Цемны Лес на лініі Орша – Сураж.

У 1811 г. в. Сінаўка, у Мсціслаўскім павеце, уласнасць памешчына. У 1852 г. ў Мсціслаўскім павеце, 20 двароў, 109 жыхароў, у складзе маёнтка Хіславічы. У 1880 г. 13 двароў, 89 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася шавецкім промыслам, вырабам посуду і іншых бытавых рэчаў з дрэва. Паводле перапісу ў 1897 г. ў Шамаўскай вол., 12 двароў, 94 жыхары, вадзяны млын. У 1909 г. 13 двароў, 115 жыхароў, мелася школа граматы. З 17.7.1924г. ў складзе БССР. У 1930г. арганізаваны калгас “Чырвоная іскра”, які абслугоўвала Курманаўская МТС. У хуткім часе калгас стаў перадавым у раёне. З 20.2.1938 г. ў Магілеўскай вобласці ў ВАВ з 14.7.1941г. да 29.9.1943 г. вёска акупіравана нямецка-фашыскімі захопнікамі. У 1990 г. 23 гаспадаркі, 40 жыхароў, у складзе калгаса імя Леніна (цэнтр Курманава). У 2007 г. ў СВК “Курманава”. Планіровачна складаецца з крывалінейнай вуліцы з завулкам, арыентаванай з ПнУ на ПнЗ. Забудавана пераважна двухбакова, няшчыльна, драўлянымі сядзібнага тыпу. Зараз ў складзе калгаса ААТ “Натапа-Агра”.

**Белы Мох** — вёска ў Падсолтаўскім с/с , на р. Белая Натапа.325 г. (1701г.)

У 1897 г. вёска, 45 двароў, 332 жыхары, у Старасельскай воласці Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 54 двары, 344 жыхары.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. 1 кастрычніка 1925 г. адкрыта школа, у якой у 1926 г. было 44 вучня. У сакавіку 1931г. арганізаваны калгас “Чырвоныбарацьбіт”, які ў 1932 аб’ядноўваў 90 гаспадарак, меў 493 га ворыва, працавала кузня. Абслугоўвала яго Курманаўская МТС.

У Вялікаю Айчынную вайну з 14.7.1941г. да 30.9.1943 г. вёска акупіравана нямецка-фашыскімі захопнікамі.

Радзіма беларускага мастака М. Я. Лісоўскага (01.03.1931 — 01.10.1970).

На 01.01.2025 складае 34 чал.

**Беразетня** — вёска ў Падсолтаўскім с/с.450 г. (1576г.).

У 1858 г. сяло, меліся млын, карчма памешчыка Дзякава. У 1880 г. 22 двары, 182 жыхары.Апрача земляробства насельніцтва займалася кушнерскім промыслам, працаваў ветраны млын, дзейнічала школа граматы. На тракце Орша — Клімавічы — Касцюковічы існавала паштовая станцыя. У 1897 г. 37 двароў, 238 жыхароў, у Шамаўскай воласці Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 37 двароў, 232 жыхары, у фальварку 13 двароў, 125 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. Адразу была адкрыта працоўная школа 1-ай ступені. У 1930 г. арганізаваны калгас "Перамога", які ў 1932 аб'яднoўваў 67 гаспадарак, меў 523 га ворыва. Абслугоўвала яго Курманаўская МТС.

У Вялікаю Айчынную вайну з13.7.1941 г. да 29.9.1943 г. вёска акупіравана нямецка-фашыскімі захопнікамі.

На 01.01.2025 складае 4 чал.

**ГЛІННЕ**– вёска ў Капачоўскім с/с, за 32 км на ПнЗ ад Мсціслава, 127 км ад Магілёва.

Па пісьмовых крыніцах вядома з пач. 19 ст. У 1816 г. вёска ў Чэрыкаўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1880 г. 15 двароў, 111 жыхароў. Паводле перапісу 1897 г. в. Глінна, 19 двароў, 116 жыхароў. Побач былі аднайменны фальварак, 1 двор, 3 жыхары, частка жыхароў займалася валяльным, шавецкім і кравецкім промысламі. У 1909 г. вёска (19 двароў, 159 жыхароў) і фальварак (1 двор, 4 жыхары) у Шамаўскай вол. Мсціслаўскага павета. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас "Чырвоны бранявік", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 43 гаспадаркі, меў 250 га ворыва, абслугоўваўся Курманаскай МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 29.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1990 г. 23 гаспадаркі, 47 жыхароў, у складзе калгаса імя Леніна (цэнтр – в. Курманава), працаваў магазін. У 2007 г. ў СВК "Курманава". Дзейнічаў магазін.

**Данілаўск** — вёска ў Падсолтаўскім с/с. 565 г. (1461г.)

У 1834 г. вёска, 7 двароў, 30 жыхароў. У 1897 г. 33 двары, 225 жыхароў, у Старасельскай воласці Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні. Побач сядзіба — 1 двор, 7 жыхароў. У 1909 г. у вёсцы 38 двароў, 249 жыхароў, на сядзібе — 1 двор, 4 жыхары.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г.  У 1931 г. арганізаваны калгас "Чырвоныпартызан", які ў 1932 аб'ядноўваў 48 гаспадарак, меў 276 га

ворыва, працавала кузня па рамонту сельгасінвентару. Абслугоўвала яго Курманаўская МТС.

У Вялікаю Айчынную вайну з 14.7.1941 г. да 29.9.1943 г. вёска акупіравана нямецка-фашыскімі захопнікамі.

**ДЗЕСНАКІТА**– вёска ў Капачоўскім с/с, за 12 км на ПнЗ ад Мсціслава, 107 км ад Магілёва.

Па пісьмовых крыніцах вядома з пач. 18 ст. У 1716 г. вёска ў валоданні езуіцкага калегіума. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1797 г. фальваркі Дзеснакіта і Гразь. У 1834 г. вёска ў Мсціслаўскім павеце, уласнасць памешчыка, які меў тут у 1850 г. 164 дзес. зямлі і карчму. Паводле перапісу 1897 г. вёска ў Старасельскай вол. Мсціслаўскага павета Магілёўскай губ., пры паштовай дарозе Мсціслаў – Шамава – Горкі, 28 двароў, 261 жыхар, вадзяны млын, крупадзёрка. Побач былі аднайменныя карчма (1 двор, 6 жыхароў), сядзіба (1 двор, 11 жыхароў, вадзяны млын), фальварак (1 двор, 9 жыхароў, ветраны млын) і аколіца (4 двары, 17 жыхароў). У 1905 г. адкрыта вінная крама, у 1906 г. – земская школа, для якой у тым годзе пабудавана памяшканне. У 1909 г. вёска (43 двары, 267 жыхароў), сядзіба (1 двор, 4 жыхары) і фальварак (1 двор, 5 жыхароў). На базе дарэв. створана прац. школа 1-й ступені, якой у 1918 г. перададзены былы памешчыцкі будынак. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1925 г. ў школе было 48 вучняў. У кастр. 1930 г. арганізаваны калгас “1 Мая”, які ў 1932 аб’ядноўваў 76 гаспадарак, меў 494 га ворыва, абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС; дзейнічала кузня. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з 14.07.1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1990 г. 34 гаспадаркі, 83 жыхары, у складзе Мсціслаўскага коннага з-да №120 (цэнтр – г. Мсціслаў). Дзейнічаў магазін. У 2007 г. вёска далучана да РУСП “Селекцыйна-гібрыдны цэнтр “Віхра”.

На 01.01.2025 складае 3 чал.

**ДУДЧЫЦЫ –** вёска ў Сялецкім с/с, за 13 км ад Мсціслава, 108 км ад Магілёва, 25 км ад чыгуначнай станцыі Крычаў на лініі Орша-Сураж.

У 1846 г. веска (10 зямельных участкаў) у складзе казённага маёнтка Шараева – Лар’янаўскае Мсціслаўскага павета. Паводле перапісу 1897 г. ў Казіміраваслабодскай вол. Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерніі, 17 двароў, 122 жыхары. У 1909 г. 20 двароў, 151 жыхар. З 17.7.1924 ў складзе БССР. Адкрылася працоўная школа 1-й ступені. З 20.08.1924 г. да 26.9.1963 цэнтр сельсавета. У 1926 г. 37 двароў, 232 жыхары. У 1929 г. арганізаваны калгас “Новы рассвет”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 35 гаспадарак, меў 272 га раллі, абслогоўваўся Мсціслаўскай МТС. Дзейнічала кузня. З 20.02.938г. ў Магілёўскай вобласці. У 1940г. 40 двароў,2015 жыхароў. У ВАВ з 17.7.1941г. да 28.9.1943г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія ў верасні 1943 г. спалілі 39 двароў. Пасля вайны адбудавана. У 1990 г. 27 гаспадарак, 56

жыхароў, у складзе калгаса імя Чапаева (цэнтр Сялец), дзейнічала стайня. З 2007 г. ў СВК імя Чапаева. Планіровачна складаецца з крывалінейнай вуліцы, арыентаванай з ПнЗ на ПнУ. Забудаваны пераважна двухбакова, шчыльна, традыцыйна індывідуальнымі драўлянымі дамамі сядзібнага тыпу.

Зараз ААТ “Сож-Агра”.

На 01.01.2025 насельніцтва складае 8 чал.

**ІВОНЫ** – вёска ў Падсолтаўскім с/с, за 25 км на ПдЗ ад Мсціслава, 97 ад Магілёва.

Па пісьмовых крыніцах вядомы з 19 ст. Памешчык меў 1841 г. 185 дзес. зямлі. У 1857 г. вёска Іваны Мсціслаўскага павета. У 1909 г. ў Шамаўскай вол. Мсціслаўскага павета, 20 двароў, 132 жыхары; у аднайменным фальварку – 13 двароў, 67 жыхароў. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1931 г. арганізаваны калгас “Чырвоная зара”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 30 гаспадарак, меў 155 га ворыва, абслугоўваўся Курманаўскай МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 да 29.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. На вясковых могілках пахаваны воін 36-й стралк. дывізіі, які загінуў у баі супраць акупантаў. У 1990 г. 40 гаспадарак, 90 жыхароў, у складзе калгаса “Савецкая Беларусь” (цэнтр – в. Падсолтава). У 2007 г. ў СВК Падсолтава.

Зараз ААТ “Натапа-Агра”.

На 01.01.2025 насельніцтва складае 1 чал.

**КАРОБЧЫНА,** вёска ўКраснагорскімсельсавеце, на р.Віхра.

У 1641 г. вёска ў Мсціслаўскім ваяводстве, у валоданні Тупічэўскага манастыра. У 1834 г. 22 двары, 122 жыхары, у Мсціслаўскім павеце. У 1874 г. заснаваны вінакурны завод. У 1880 г. адкрыта земская школа. У 1897 г. 34 двары, 234 жыхары, у Казіміраваслабодскай воласці Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні. Побач былі 2 сядзібы,у адной — 1 двор, 5 жыхароў, у другой – 1 двор, 17 жыхароў. Працаваў вадзяны млын. У 1909 г. 33 двары, 241 жыхар.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ўлістападзе 1917 г. была адкрыта школа 1-ай ступені ў якой у 1925 г. налічвалася 30 вучняў, дзейнічала бібліятэка. У 1926 г. каля вёскі на р. Віхрапабудавана гідраэлектрастанцыя магутнасцю 75 кілават. У 1929 г. арганізаваны калгас імя Горкага, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 45 гаспадарак, меў 159 га ворыва, абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС імя Кірава. У 1937 г. адкрыты яслі.

У Вялікую Айчынную вайну з 14 ліпеня 1941 г. па 28 верасня 1943 г. веска была акупіравана гітлераўцамі. Нямецка-фашысцкія захопнікі ў 1943 г. часткова спалілі вёску. З 70 дамоў засталося толькі 30. Вяскоўцы жылі ў зямлянках да 1947 г.

У 1990 г. 123 гаспадаркі, 322 жыхары, цэнтр калгаса “1 Мая”, які спецыялізаваўся на мяса-малочнай жывелагадоўлі і птушкагадоўлі, меў 2794 га сельгасугоддзяў, у тым ліку 1937 га ворава. У весцы працавалі дзіцячы сад-

яслі, сярэдняя школа, Дом культуры, сталовая, 2 магазіна, комплексны прыемны пункт быт. абслугоўвання насельніцтва, аддз.сувязі, аўтаматычная тэлеф. станця, птушкафабрыка. У 2007 г. далучана да СВК “Сож-Агра”. Есць магазін, аддзяленне сувязі. Генеральны план забудовы вескі распрацаваны ў 1976 г. у інстытуце “Магілеўграмадзянпраект”. Планіровачна складаецца з працяглай прамалінейнай вуліцы, арыентаванай з ПнУ на ПнЗ, ад якой пад прамым вуглом ад абодвух бакоў адыходзяць кароткія прамалінейныя вуліцы. Забудавана двухбакова, пераважна няшчыльна, традыцыйна драўлянымі дамамі сядзібнага тыпу.

На 01.01.2025 насельніцтва складае 330 чал.

**КУРМАНАВА** – вёска ў Падсолтаўскім с/с, за 28 км на ПнЗ ад Мсціслава, 123 км ад Магілёва, 12 км ад чыг. ст. Цёмны Лес на лініі Орша – Сураж.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 19 ст. як маёнтак Курманава. У 1825 г. тут заснаваны сукнавальня і вінакурная вытворчасць (у 1881 г. 9 рабочых). У 1857 г. вёска і фальварак у Мсціслаўскім павеце. У 1860 г. вёска, цэнтр аднайменнага маёнтка, уласнасць памешчыка, якая мела тут у 1877 г. 6295 дзес. зямлі, вінакурны з-д, 2 млыны, сукнавальню і 2 карчмы. У 1880 г. ў Шамаўскай вол., 23 двары, 161 жыхар. Паводле перапісу 1897 г. 34 двары, 222 жыхары, у фальварку – 71 двор. Дзейнічалі млын, сукнавальня, піцейны дом. У снеж. 1905 г. прыбыўшы з Масквы на радзіму селянін М. Старчакоў вёў рэв. прапаганду, заклікаў да паўстання. У 1909 г. ў вёсцы 39 двароў, 254 жыхары, у фальварку – 29 жыхароў. У чэрв. 1917 г. сяляне, што выконвалі пастанову вал. к-та, забралі ў памешчыцы маёнтак, падзялілі зямлю, рэквізавалі 85 галоў жывёлы, высеклі вял. надзел лесу. У 1923 г. адкрыта прац. школа 1-й ступені. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. З 20.08.1924 г. да 20.02.1938 г. цэнтр сельсавета. У 1925 г. створана закупачна-збытавое с.-г. крэдытнае т-ва. У 1929 г. арганізаваны саўгас “Чырвоны сцяг”, які ў 1933 г. меў 4 трактары і іншую с.-г. тэхніку. У вёсцы быў таксама калгас “VI з’езд Саветаў Мсціслаўшчыны”, які ў 1932 г. аб’ядноўваў 36 гаспадарак, меў 172 га ворыва. У 1937 г. на базе скасаванага саўгаса створана Курманаўская МТС (рэарганізавана 31.03.1958 г.), адкрыты дзіцячыя яслі, дзейнічалі цагельны і лёнаапрацоўчы з-ды. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл.З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну 14.07.1941 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. Вызвалена 29.09.1943 г. часцямі 277-й стралк. дывізіі. У цэнтры вёскі, каля будынка праўлення калгаса, на ўшанаванне памяці 220 землякоў, якія загінулі на фронце і ў партыз. барацьбе, у 1968 г. пастаўлены абеліск. У 1990 г. 127 гаспадарак, 291 жыхар, цэнтр калгаса Леніна, які спецыялізаваўся на мясамалочнай жывёлагадоўлі. Меў 4841 га сельгасугоддзяў. У вёсцы працавалі дзіцячы сад, сярэдняя і муз. школы, б-ка. Дом культуры, бальніца, аптэка, урачэбная амбалаторыя, сталовая, прадуктовы і прамтаварны магазін, комплексны прыёмны пункт быт.абслугоўвання насельніцтва, швейная

мастэрня, аддз. сувязі, аўтаматычная тэлеф. станцыя. У 2007 г. цэнтр СВК "Курманава". Зараз ААТ "Натапа-Агра".

На 01.01.2025 насельніцтва складае 179 чал.

**ЛАПАЦІНА** – вёска ў Мушынскім с/с, за 22 км на ПдЗ ад Мсціслава, 90 км ад Магілёва.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 1706 г. як вёска ў складзе маёнтка Маляцічы Мсціслаўскага ваяв. ВКЛ, шляхецкая ўласнасць. У 1763 г. цэнтр маёнтка Лапацін, 23 двары, карчма, бровар (піваварня), уласнасць памешчыка. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. З 1785 г. дзейнічала сукнавальня. У 1858 г. ў фальварку, што існаваў побач з вёскай, 6 двароў, 35 жыхароў; памешчык меў тут 358 дзес. зямлі. У 1880 г. 37 двароў, 196 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася шавецкім промыслам. Паводле перапісу 1897 г. ў вёсцы 46 двароў, 303 жыхары, у фальварках Лапаціна 1 – 5 двароў, 34 жыхары, у Лапаціна 2 – 1 двор, 16 жыхароў. У 1909 г. ў вёсцы 55 двароў, 324 жыхары, у маёнтку – 24 жыхары, вадзяны млын. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. У 1926 г. 78 двароў, 316 жыхароў. У 1931 г. арганізаваны калгас "Шлях сацыялізму", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 57 гаспадарак, меў 450 га ворыва, абслугоўваўся Ходасаўскай МТС імя Тэльмана. У 1934 г. абсталявана новае памяшканне для 7-гадовай школы. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У 1940 г. да вёскі далучаны пас. Зады. У Вял. Айч. вайну з 15.07.1941 г. да 03.10.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. У 1990 г. 45 гаспадарак, 107 жыхароў. У 1990 г. 45 гаспадарак, 107 жыхароў, у складзе саўгаса "Перамога" (цэнтр – в. Мушына). Працавалі пач. школа, магазін. У 2007 г. ў СВК "Мушына". Працаваў магазін. Зараз ААТ "Мушына-Агра".

На 01.01.2025 насельніцтва складае 20 чал.

**ЛАР'ЯНАВА** – вёска ў Мазалаўскім с/с, за 8 км на Пд ад Мсціслава, 103 км ад Магілёва.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 18 ст. У 1701 г. дзяржава ў Мсціслаўскім ваяв. ВКЛ. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Рас. імперыі. У 1846 г. вёска (11 зямельных участкаў) у складзе казённага маёнтка Шараева-Лар'янаўскае. Памешчык меў тут у 1847 г. 178 дзес. зямлі. У 1858 г. ўласнасць памешчыка. Паводле перапісу 1897 г. ў Казіміраваслабодскай вол. Мсціслаўскага павета, 31 двор, 208 жыхароў. У 1909 г. 36 двароў, 235 жыхароў. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. Адкрыта прац. школа 1-й ступені. У 1962 г. 52 двары, 270 жыхароў. У 1930 г. арганізаваны калгас імя Сталіна, які ў 1932 г. аб'ядноўваў 52 гаспадаркі, меў 264 га зямлі, з 1933 г. абслугоўваўся Мсціслаўскай МТС. З 20.02.1938 г. ў Магілёўскай вобл. У Вял. Айч. вайну з ліп. 1941 г. да 28.09.1943 г. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі, якія ў вер. 1943 г. спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. На ўшанаванне памяці 91 земляка, што загінулі на фронце і ў парт. барацьбе, на ўсх. ускраіне ў 1970 г. пастаўлены абеліск. У 1976 г.

далучана в. Рафалава. У 1990 г. 82 гаспадаркі, 170 жыхароў, цэнтр калгаса імя Кірава, які спецыялізаваўся на мясамалочнай жывёлагадоўлі, вырошчванні збожжавых і лёну, меў 1754 га сельгасугоддзяў. У вёсцы працавалі дзіцячы сад, пач. школа, б-ка, клуб, гандл. цэнтр, сталовая, комплексны прыёмны пункт быт. абслугоўвання насельніцтва, фельч.-акушэрскі пункт, аддз. сувязі. З 2007 г. ў складзе СВК "Мазалаўскі".

Зараз ААТ "Мазалаўскае".

На 01.01.2025 насельніцтва складае 145 чал.

**ПАДСОЛТАВА –** веска, цэнтр Падсолтаўскага с/с, за 20 км на ПнЗ ад Мсціслава, 115 км ад Магілёва, 18 км ад чыгуначнай станцыі Цемны Лес на лініі Орша – Сураж. Рэльеф раўніны. На З цячэ рака Белая Натапа (прыток ракі Чорная Натапа). Транспартныя сувязі па мясцовай дарозе праз в. Занькаўшчына і далей па шашы Мсціслаў – Горкі. 106 гаспадарак, 260 жыхароў (2007).

Па пісьмовых крыніцах вядома з 18 ст. У 1781 г. сяло Поцалтава ў Мсціслаўскім павеце. Памешчык меў тут у 1858 г. 610 дзес. зямелі, млын і карчму. Паводле перапісу 1897г. сяло Пацолтава ў Старасельскай воласці Мсціслаўскага павета Магілеўскай губерніі, 4 двары, 13 жыхароў, драўляная царква (адкрыта не пазней 1880г.), царкоўна – прыходская школа, штогод (9 мая, 20 ліпеня) праводзіліся кірмашы. Побач былі фальварак, 1 двор, 9 жыхароў, ветраны млын, кузня, і карчма – 1 двор, 9 жыхароў. У 1909 г. 20 двароў, 104 жыхары, вінная крама, нафтавы млын, кузня. З 17.07.1924 г. ў складзе БССР. З 20.08.1924 г. цэнтр сельсавета. На базе дарэвалюцыйнай створана працоўная школа 1-й ступені, у якой у 1926 г. было 124 вучні. У 1930 г. арганізаваны калгас "Сталінскі прыліў", які ў 1932 г. аб'ядноўваў 34 гаспадаркі, меў 240 га ворава, абслугоўваўся Курманаўскай МТС. У 1934 г. на льнозаводзе ўведзена ў строй устаноўка па выпрацоўцы электраэнергіі. З 20.02.1938 г. ў Магілеўскай вобласці у ВАВ з ліпеня 1941 да 29.09.1943 г. акупіравана ням.фаш. захопнікамі. У брацкай магіле, што на могілках, пахаваны 6 воінаў, у іх ліку байцы 36-й стралковай дэвізіі, якія загінулі ў 1943 г. ў баі за вызваленне вёскі. У цэнтры вёскі на ўшанаванне памяці 170 землякоў – воінаў і партызан, загінуўшых у барацьбе супраць фашызму, у 1971 г. пастаўлена стэла. У 1990 г. 112 гаспадарак, 311 жыхароў, цэнтр калгаса "Савецкая Беларусь", які спецыялізаваўся на мясамалочнай жывелагадоўлі і льнаводстве. Меў 3220 га сельгасугоддзяў. У вёскі працавалі сярэдняя школа, дзіцячы сад, біліятэка, фельч.-акушэрскі і ветэрынарны пункты, швейная майстэрня, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, сталовая, 2 магазіна, аддзяленне сувязі. З 2007 г. цэнтр СВК "Савецкая Беларусь", сярэдняя агульнаадукацыйная школа, клуб, магазін, аддзяленне сувязі, комплексы прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, філіял Мсціслаўскага УПК "Бытпаслугі". Зараз ААТ "Натапа-Агра".

На 01.01.2025 насельніцтва складае 210 чал.

**СЛЁЗКІ** – на пісьмовых крыніцах вядома з пачатку 18 ст. У 1701 г. дзяржава Слёзкі Мсціслаўскага ваяводства. ВКЛ. У 1846 г. вёска Слёзкі Рабскі ў складзе казённага маёнтка Шараева – Ларыенаўскае Мсціслаўскага павета, 8 зямельных участкаў. Паводле перапісу 1897 г. вёска Рабскі-Слёзкі ў Казіміраваслабодскай воласці Мсціслаўскага павета, 13 двароў, 85 жыхароў. З 17.07.1924г. ў складзе БССР. У 1929 г. арганізаваны калгас “Чырвоны баявік”, які абслугоўвала Мсціслаўская МТС імя Кірава. З 20.02.1938г. ў Магілёўскай вобласці. У 1940г. 21 двор, 117 жыхароў. У ВАВ з 17.07.1941 да 28.09.1943гг. акупіравана нямецка-фашыскімі захопнікамі, якія ў верасні 1943 г. спалілі вёску (18 двароў). Пасля вайны адбудавана. У 1990 г. 17 гаспадарак, 35 жыхароў, у складзе калгаса імя Чапаева (цэнтр Сялец). Працавалі клуб, магазін. У 2007 г. веска ў СВК імя Чапаева. Планіровачна складаецца з крывалінейнай вуліцы з завулкам. Зараз ААТ “Сож-Агра”.

На 01.01.2025 насельніцтва складае 6 чал.

**СТАРОЕ СЯЛО** -вёска ў Капачоўскім сельсавеце, на р. Чорная.

У 1586 г. сяло ў Мсціслаўскім ваяводстве, шляхецкая ўласнасць. У 1654 г. маёнтак Старое Сяло разам з вёскамі Бізюкі і Аслонцы аддадзены Мсціслаўскаму кармяліцкаму кляштару. З 1781 г. дзейнічала царква. З 1830 г. працавала сукнавальня. У 1834 г. 15 двароў, 70 жыхароў. У 1880 г. 39 двароў, 320 жыхароў, дзейнічала земская школа. Працаваў млын. У 1897 г. 60 двароў, 424 жыхары ў Мсціслаўскім павеце. Цэнтр воласці Магілёўскай губерні. Дзейнічалі фельчарскі ўчастак, 2 хлебазапасныя магазіны. Працавала сукнавальня. Побач фальварак – 1 двор, 28 жыхароў, карчма – 1 двор, 4 жыхары. У 1909 г. у сяле 79 двароў, 441 жыхар, у фальварку – 1 двор, 6 жыхароў.

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. Была адкрыта працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1925 г. было 123 вучні, 4 дзесяціны зямлі. Працавалі хата-чытальня, бібліятэка, пункт па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых і фельч.-акушэрскі пункт. З 20.08.1924 г. да 21.04.1978 г. цэнтр сельсавета. У 1928 г. арганізаваны калгас імя Чарвякова, які з 1933 г. абслугоўвала Мсціслаўская МТС імя Кірава. З 20.02.1938г. ў Магілёўскай вобласці у ВАВ з 14.07.1941 веска акупіравана нямецка-фашыскімі захопнікамі, якія 28.09.1943 г. спалілі вёску. Пасля вайны адбудавана. У 1990 г. 78 гаспадарак, 230 жыхароў, у складзе калгаса “Праўда” (цэнтр в. Шамаўшчына). Працавалі сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, магазін, фельч.-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі. У 2007 годзе веска ў складзе РУПС “Селекцыйна-гібрітны цэнтр “Віхра”. Дзейнічае магазін.

На 01.01.2025 насельніцтва складае 26 чал.

**СТАРЫНКА** - вёска ў Ходасаўскім сельсавеце.

У 1816 г. 14 двароў, 101 жыхар. У 1883 г. 30 двароў, 186 жыхароў, у Доўгавіцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Акрамя

земляробства частка насельніцтва займалася сталярным промыслам. У 1897 г. 43 двары, 284 жыхары. У 1909 г. 47 двароў, 266 жыхароў. Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. У 1925 г. адкрыта працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1927 г. было 58 вучняў, дзейнічаў гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых. У 1931 г. арганізаваны калгас «Новая вёска», які ў 1932 г. аб'ядноўваў 65 гаспадарак, меў 523 га ворыва, абслугоўвала яго Ходасаўская МТС імя Тэльмана. Працавала кузня па рамонту сельгасінвентару. У Вялікую Айчынную вайну з 14 ліпеня 1941 г. да 28 верасня 1943 г. вёска была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1990 г. 51 гаспадарка, 122 жыхары, у складзе “XXVI з’езд КПСС” (цэнтр – в. Усполле). Працавалі пачатковыя школа, магазін. У 2007 г. веска ў складзе ААТ “Мсціслаўскі райаграпрамтэхзаб”. Дзейнічае магазін.

**СЯЛЕЦ** – вёска Краснагорскага с/с, на р. Чорная Натапа.

У 1811 г. 47 двароў, 108 жыхароў, у Чэрыкаўскім павеце, царкоўная ўласнасць. У другой палове XVIII ст. у былой вёсцы Ануфрыева (цяпер яна ў складзе вёскі Сялец), была пабудавана царква, якая зараз з'яўляецца помнікам архітэктуры пераходнага перыяду ад барока да класіцызму. У 1878 г. адкрыта школа ў вёсцы Сялец. У 1883 г. 106 двароў, 629 жыхароў, у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. Акрамя земляробства частка насельніцтва займалася сталярным і кравецкім промысламі. У 1897 г. 137 двароў, 967 жыхароў у Маляціцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. У 1909 г. 190 двароў, 1187 жыхароў. Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. Была адкрыта працоўная школа 1-ай ступені, у якой у 1926 г. было 90 вучняў. У 1929 г. арганізаваны калгасы «Чырвоны Сялец» і «Чырвоны кулямётчык», якія затым аб'ядналіся ў калгас імя Варашылава.

У Вялікую Айчынную вайну з 14 ліпеня 1941 г. да 28 верасня 1943 г. вёска была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Гітлераўцы спалілі вёску.

Пасля вайны адбудавана. У 1967 г. да вёскі далучаны вёска Сялец-Галоўчыцы, у 1976 г. вёска Ануфрыева, якая з’яўляецца радзімай заслужанага работніка вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь, прафесара В. М. Ільіна (н. 31.03.1930 г.). У 1990 г. 282 гаспадаркі, 694 жыхары, цэнтр калгаса імя Чапаева, які спецыялізаваўся на мясамалочнай жывелагадоўлі і вырошчванні лену. Меў 4483 га сельгасугоддзяў. У весцы працавалі дзіцячы сад-яслі, сярэдняя школа з вучэбна-вытворчым камбінатам (25 настаўнікаў і выхаванцаў), бібліятэка, Дом культуры, гандлевы цэнтр, сталовая, фельч.-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, комплесны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва,аўтаматычная тэлефонная станцыя, ветэрынарны ўчастак. У 2007 г. цэнтр СВК імя Чапаева, дзіцячы сад, сярэдняяя школа, Дом культуры, бібліятэка, фельч.-акушэрскі пункт, магазін, адддзяленне сувязі, комплексны прыёмны пункт бытавога абслугоўвання насельніцтва, філіялМсціслаўскага УПК “Бытпаслугі”.

Зараз ААТ “Сож-Агра”.

На 01.01.2025 насельніцтва складае 315 чал.

**ЧОРНАЯ САСНА –** па пісьмовых крыніцах вядома з пачатку 19 ст. У 1816 г. вёска ў Чэрыкаўскім павеце, 13 двароў, 87 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1880 г. 16 двароў, 105 жыхароў. Частка вяскоўцаў займалася калёсным промыслам. Паводле перапісу 1897 г. ў Беліцкай вобласці Чэрыкаўскага павета, 24 двары, 153 жыхары. У 1909 г. 40 двароў, 166 жыхароў. У 1910 г. адкрыташкола. З 17.07.1924 ў складзе БССР. У 1931 арганізаваны калгас “Чырвоная зорка”, які ў 1932г. аб’ядноўваў 36 гаспадарак, меў 282 га ворава, абслугоўваўся Ходасаўскім МТС імя Тэльмана. З 20.02.1938 ў Магілёўскай вобласці. З 20.07.1941 г. да 30.09.1943г. акупіравана нямецка-фашыскімі захопнікамі. У 1990г. 11 гаспадарак, 18 жыхароў, у складзе саўгаса “Забалацце” (цэнтр Забалацце), працаваў магазін. У 2007 г. вёска ў складзе УКСП саўгас “Забалацце”. Зараз ААТ “Забалацце-Аграстандарт”.

**ШЫРКІ —** вёска ў Капачоўскім сельсавеце. У 1811 г. вёска, 40 двароў, 107 жыхароў, у Доўгавіцкай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні, уласнасць памешчыка Стахоўскага, які меў тут 649 дзесяцін зямлі і вадзяны млын. У 1883 г. 25 двароў, 128 жыхароў. Акрамя земляробства частка насельніцтва займалася сталярным промыслам. У 1897 г. 35 двароў, 243 жыхары. У 1909 г. у вёсцы 40 двароў, 279 жыхароў, у маёнтку — 1 двор, 2 жыхары (належаў барону фон Корфу).

Савецкая ўлада ўстаноўлена ў студзені 1918 г. У 1919 г. адкрыта працоўная школа граматы 1-ай ступені, у якой у 1927 г. было 63 вучні. У 1931 г. арганізаваны {Чырвоная камуна», які ў аб'ядноўваў 66 гаспадарак і ворыва, абслугоўвала яго МТС.

Айчынную вайну з 14 ліпеня да 29 верасня 1943 г. вёска была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Зараз у складзе РУСП СГЦ “Віхра”.

**Каляндар знамянальных і памятных дат на 2026 год**
**Мсціслаўскі раён**

Бібліяграфічны паказальнік

складальнік Хмуровіч Святлана Віктараўна

адказны за выпуск Н. В. Сідарэнкава

Дзяржаўная ўстанова культуры
“Сетка публічных бібліятэк Мсціслаўскага раёна”

213453 г. Мсціслаў вул. Пралятарская, 36
Тэлефон (02240)44870
Эл. пошта: Mstislavl_bib@mail.ru